Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

14 МАЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 89 (27947) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Абярэгі Марыі

СТАР. 3



Чым даражыць Святлана Бароўская?

СТАР. 5



Як палюбіць гатаваць?

СТАР. 7

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай СНАПКОЎ, намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Беларусь і Кітай падчас візіту Старшыні КНР Сі Цзіньпіна падпісалі каля 50 пагадненняў і мемарандумаў, пачынаючы з дагавора аб дружбе і заканчваючы міжбанкаўскім пагадненнем. Мяркуем, што сума ў $8 млрд не з'яўляецца тут канчатковай. Калі казаць пра кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень», то яшчэ ў 2010 годзе Аляксандр Лукашэнка і Сі Цзіньпін вызначылі неабходнасць яго будаўніцтва. У рамках дзяржаўнага візіту Старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі было абвешчана, што «Вялікі камень» з'яўляецца жамчужынай кітайскай канцэпцыі «Пояс і шлях». Беларусь са сваёй развітай інфраструктурай — чыгуначнай, аўтамабільнай — гатова забяспечваць транзіт».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.05.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 14160,00 | ▼ |
| Еўра | 15920,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 286,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 688,65 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# МАЙСКІ ДЗЕНЬ ГОД НАКОРМІЦЬ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Здымнае жыллё

# ЛЕТА ТАННЫХ КВАТЭР

## Эксперты сталічнага рынку арэнды прагназуюць далейшае зніжэнне цэннікаў

**Сёння на рынак арэнды паўплываюць адначасова і наступствы змены валютных курсаў, а таксама сезонны спад актыўнасці арандатараў. Да традыцыйнага летняга ажыўлення яшчэ далёка, а прапанова кватэр застаецца на максімуме апошніх гадоў. Пра сённяшнюю сітуацыю на сталічным рынку ў сегменце доўгатэрміновай арэнды і прагнозы на найбліжэйшую перспектыву карэспандэнту «Звязды» паведаміла спецыяліст аддзела жыллёвай арэнды цэнтра гандлю нерухомасцю «ПАКАДАН» Алена АГРЫЗКА.**

### ПРАПАНОВА ПЕРАВЫШАЕ ПОПЫТ У 2-3 РАЗЫ

Менавіта красавік-май ужо традыцыйна лічыцца перыядам з самай нізкай актыўнасцю будучых кватарантаў. Не стаў выключэннем і гэты год, бо пачынаючы са студзеня попыт на здымнае жыллё ў Мінску толькі зніжаўся.

Новыя валютныя курсы даволі адчувальна ўдарылі па даходах арандатараў. Многія з іх апынуліся не ў стане плаціць па цэнах (у валюце) 2014 года і з'язджалі, калі ім не ўдавалася дамовіцца з уласнікамі аб зніжэнні платы за кватэру. Таму ў студзені спецыялісты назіралі даволі незвычайную карціну, калі адначасова працягвала павялічвацца прапанова, але рос і попыт на арэнднае жыллё. Амаль на працягу двух першых месяцаў года ў сталіцы назіраліся масавыя «пераезды» арандатараў. Частка з іх вярталася назад у кватэры бацькоў, іншагароднія часам развітваліся з марай аб вялікіх заробках у сталіцы і ад'язджалі ў свае невялікія гарадкі і вёскі. Аднак самая вялікая колькасць кватарантаў шукала на рынку больш таннае жыллё. І не толькі шукала, але і знаходзіла.

У маі падобныя пераезды ўжо скончыліся, а попыт вярнуўся ў звычайны для гэтай пары года стан. Што тычыцца прапановы, то ў красавіку колькасць свабодных кватэр нават трохі скарацілася. Паводле інфармацыі спецыялізаванага партала Realt.by, агульнае зніжэнне прапановы кватэр за мінулы месяц склала 1,6%. У залежнасці ад колькасці пакояў дынаміка прытоку ці адтоку аб'ектаў адрознівалася кардынальным чынам. Так, прапанова аднапакаёвых кватэр вырасла на 2,4%, трохпакаёвых стала большай адразу на 17,1%. У той жа час колькасць двухпакаёвых кватэр на рынку зменшылася на 10,7%. Аднак, у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, прапанова кватэр на рынку арэнды павялічылася на 9%.

— Заўважу, што такое павелічэнне прапановы агульную карціну на рынку не паказвае, — лічыць Алена Агрызка, — бо сёння колькасць рэальных кліентаў ажно ў 2-3 разы меншая за існуючы аб'ём прапановы.

### З'ЯВІЛІСЯ АДНАПАКАЁЎКІ І ЗА 250 ДОЛАРАЎ

А выбар стандартных і недарагіх аднапакаёвых кватэр у сталіцы цяпер унушальны. Звычайную невялікую кватэру па цэнніку ў межах 250-300 долараў спецыялісты агенцтваў нерухомасці адшукаюць кліенту на працягу 2-3 дзён. Такое жыллё будзе мець прапіску панэльнага дама аднаго са спальных раёнаў. Зрэдку зараз сустракаюцца і таннейшыя варыянты бюджэтнага жылля.

СТАР. 3

■ Парламенцкі дзённік

# ВЫХОЎВАЦЬ НЕ ТОЛЬКІ ПАКАРАННЕМ

## Пад амністыю трапляе больш за 8,5 тысячы асуджаных

**Учора дэпутаты Палаты прадстаўнікоў адразу ў двух чытаннях прагаласавалі за законапраект аб амністыі ў сувязі з 70-годдзем Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Ён быў распрацаваны Міністэрствам унутраных спраў па даручэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

### АКРАМЯ НАРКАДЗЯЛКОЎ І ПЕДАФІЛАЎ

— Амністыя — гэта акт гуманізму і міласэрнасці з боку дзяржавы, — заўважыў **старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА**. — Сёлета ён прымеркаваны да 70-гадовага юбілею Вялікай Перамогі. Задача дзяржавы — не толькі пакараць злачынцу, але і даць шанц людзям, якія спатыкнуліся і асэнсавалі сваю віну, вярнуцца ў сем'і, да работы, нармальнага жыцця. Для чалавека важна, што дзяржава гатова аказаць яму падтрымку ў складанай жыццёвай сітуацыі.

**Амністыю выкарыстоўваюць толькі ў дачыненні да асоб, якія станоўча характарызуюцца падчас адбывання пакарання. Адной з умоў яе прымянення з'яўляецца поўнае пакрыццё нанесенай злачынствам шкоды або ўрону.**

**Міністр унутраных спраў Ігар ШУНЕВІЧ** паведаміў дэпутатам, што дадзены законапраект не мае істотных адрозненняў ад леташняга закона аб амністыі. На гэты раз пашырана катэгорыя асоб, якія трапляюць пад яе дзеянне. Мяркуецца вызваліць ад мер крымінальнай адказнасці ў выглядзе асуджэння з адтэрміноўкай выканання прыгавору, асуджэння з умоўным непрымяненнем пакарання, асуджэння без прызначэння пакарання асоб, прыгаворы ў адносінах да якіх пастаноўлены на дзень уступлення ў сілу Закона аб амністыі. Прадугледжваецца вызваленне ад пакарання асоб, якія асуджаны за лжэпрадпрымальніцтва, калі яны адбылі не менш за траціну прызначанага тэрміну.

Разам з тым, пашырана і катэгорыя асоб, на якіх не распаўсюджваецца амністыя. Гэта асобы, што здзейснілі незаконны абарот і перамяшчэнне праз дзяржаўную мяжу Беларусі наркотыкаў, сеялі або вырошчвалі забароненыя расліны або грыбы, якія змяшчаюць наркатычныя рэчывы, схілялі іншых да ўжывання наркотыкаў, арганізоўвалі або ўтрымлівалі наркапрытоны ці наркалабараторыі. Не трапяць пад амністыю таксама асуджаныя за палавыя зносіны або дзеянні сексуальнага характару з дзецьмі да 16 гадоў.

— Рэалізацыя ранейшых законаў аб амністыя не аказала істотнага негатыўнага ўплыву на крымінагенную абстаноўку, — паведаміў міністр унутраных спраў. — Амністыю выкарыстоўваюць толькі ў дачыненні да асоб, якія станоўча характарызуюцца падчас адбывання пакарання. Адной з умоў яе прымянення з'яўляецца поўнае пакрыццё нанесенай злачынствам шкоды або ўрону. Гэта паслужыць таму, што асуджаныя будуць імкнуцца вярнуць нанесеныя страты дзяржаве або іншаму чалавеку.

Па папярэдніх падліках у сёлетнюю амністыю могуць быць вызвалены каля 8600 асуджаных, у тым ліку з месцаў пазбаўлення волі — 2200 чалавек, з папраўчых устаноў адкрытага тыпу — 715 і 5675 асуджаных, якія стаяць на ўліку ў крымінальна-выканаўчых інспекцыях органаў унутраных спраў.

Безумоўнае вызваленне ад усіх відаў крымінальнага пакарання, а таксама спыненне папярэдняга расследавання па крымінальных справах прадугледжана ў адносінах да пэўнай катэгорыі грамадзян, якія здзейснілі менш цяжкае злачынства або злачынства, што не нясе вялікай небяспекі для грамадства. Да гэтай катэгорыі адносяцца: непаўналетнія асобы, цяжарныя жанчыны, жанчыны і адзінокія мужчыны, якія маюць дзяцей да 18 гадоў, пенсіянеры, інваліды I, II груп, хворыя на актыўную форму сухотаў, анкалагічныя захворванні II — IV ступені, ВІЧ-інфіцыраваныя III, IV стадыі, ветэраны баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, грамадзяне, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і іншых радыяцыйных аварый, асобы, што атрымалі раненне або захворванне падчас службы ва ўзброеных сілах, у сувязі з ажыццяўленнем службовых абавязкаў падчас службы ў Следчым камітэце, Дзяржаўным камітэце судовых экспертыз, органах унутраных спраў, фінансавых расследаванняў дзяржкантролю, пракуратуры, органах Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

Законапраект вызваляе ад пакарання ў выглядзе абмежавання або пазбаўлення свабоды асуджаных за злачынствы, якія не маюць вялікай небяспекі для грамадства, калі прыгаворы пастаноўлены на дзень уступлення ў сілу закона, а таксама асуджаных за менш цяжкія злачынствы, калі яны адбылі не менш за чвэрць прызначанага тэрміну.

— У нашым грамадстве заўсёды актыўна абмяркоўваюцца пытанні, звязаныя з амністыяй, — сказаў судакладчык па законапраекце **Валерый ГАЙДУКЕВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі па нацыянальная бяспецы**. — Законы аб амністыі выступаюць у якасці інструмента публічнай дапамогі для асуджаных асоб пачаць новае жыццё. У нашай краіне стала добрай традыцыяй ініцыяваць такія законы кіраўніком дзяржавы, пры гэтым пытанні правядзення ў Беларусі чарговай амністыі абавязкова ўсебакова дасканала прапрацоўваюцца для прыняцця ўзважанага, абгрунтаванага рашэння з улікам інтарэсаў грамадзян і дзяржавы.

**Аляксандр СЯГОДНІК, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы**, лічыць, што ініцыятыва Прэзідэнта Беларусі сведчыць пра яго ўсебаковае веданне праблем, якія ёсць у жыцці краіны і яе грамадзян.

— Злачынцы — гэта людзі, якія спатыкнуліся, ступень злачынства таксама можа быць рознай, і калі чалавек асэнсаваў, што парушаць закон нельга, то амністыя дасць яму шанц, — адзначае парламентарый. — Вельмі сімвалічным, чалавечным і дальнабачным з'яўляецца прымяркоўванне такога акта гуманізму да свята, да падзеі, дзеля якой нашы продкі аддалі свае жыцці.

Міністр унутраных спраў паведаміў журналістам, што паказчык рэцыдыву пасля папярэдніх амністый вагаўся ў межах 24-28%. Што тычыцца хворых на адкрытыя формы сухотаў, то Міністэрства ўнутраных спраў разам з Міністэрствам аховы здароўя прадумваюць механізм, які дазволіць паспяхова завяршыць лячэнне такіх асоб.

### АЛЬТЭРНАТЫВА ДЛЯ ДОБРАСУМЛЕННЫХ

У Авальнай зале Палаты прадстаўнікоў учора таксама быў прыняты ў другім чытанні законапраект аб альтэрнатыўнай службе.

— Асноўныя папраўкі ў праект закона былі ўнесеныя яшчэ да першага чытання, — паведаміў журналістам **старшыня Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Уладзімір ВАСІЛЕНКА**. — Да другога чытання мы па аналогіі з ваеннаслужачым тэрміновай службы дапоўнілі палажэнне пра тое, што асоба, якая праходзіць альтэрнатыўную службу, мае права на атрыманне бясплатных медыцынскіх прэпаратаў у выпадку хваробы. Акрамя таго, мы зрабілі папраўку наконт таго, што чалавек, які знаходзіцца ў чарзе на жыллё, мае права заставацца ў ёй падчас праходжання ўсёй альтэрнатыўнай службы плюс адзін год.

Дэпутат нагадаў, што праект закона аб альтэрнатыўнай службе датычыцца толькі тых, хто не можа браць зброю ў рукі па сваіх рэлігійных перакананнях. Размова ідзе пра маладых людзей ва ўзросце ад 18 да 27 гадоў, якія прызнаны годнымі да вайсковай службы. Мяркуецца, што колькасць «альтэрнатыўнікаў» будзе не большай за 100 чалавек у год.

На пытанне, ці няма ў заканадаўцаў боязі вялікай колькасці падманаў у сувязі з магчымасцю праходзіць альтэрнатыўную службу, парламентарый адказаў: «Мы спадзяёмся, што гэты закон будзе накіраваны толькі на добрасумленных грамадзян. І зрабілі так, каб альтэрнатыўная служба не стала прывабнай для маладых людзей: яе тэрмін павялічаны ў два разы (для тых, хто мае вышэйшую адукацыю, — 24 месяцы, для астатніх — 36 месяцаў)».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■

# УЛАДА АДКАЗВАЕ НА ПЫТАННІ

## У краіне працягваюць працу прамыя тэлефонныя лініі



Яны функцыянуюць кожную суботу з раніцы да поўдня. Паралельна з кіраўніцтвам абласцей прамыя тэлефонныя лініі праводзяць старшыні гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў, іх намеснікі і кіраўнікі справамі.

Пытанні ЖКГ, жыллёвая палітыка, якасць дарог і пытанні сацыяльнага характару — кожны беларус можа агучыць свае праблемы і звярнуцца да ўлады.

**Тэлефонныя лініі ў гэтую суботу, 16 мая, з 9.00 да 12.00 правядуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
намеснік старшыні
Сакоўскі Віктар Яўгенавіч — 80162213121;

**Віцебскі аблвыканкам**
намеснік старшыні
Мацкевіч Алег Сяргеевіч — 80212204260;

**Гомельскі аблвыканкам**
старшыня
Дворнік Уладзімір Андрэевіч — 80232751237;

**Гродзенскі аблвыканкам**
старшыня
Краўцоў Уладзімір Васільевіч — 80152735644;

**Мінскі аблвыканкам**
старшыня абласнога Савета дэпутатаў
Ліпніцкі Іван Эдуардавіч — 80175004160;

**Магілёўскі аблвыканкам**
кіраўнік справамі
Варонін Рыгор Аляксандравіч — 80222501869;

**Мінскі гарвыканкам**
першы намеснік старшыні
Кухараў Уладзімір Яўгенавіч — 80172224444.

■ Факт

### АЛЕЯ Ў ГОНАР ПЕРАМОГІ

Дабрачынная акцыя «Сад Вялікай Перамогі» прайшла ў святочныя дні ў вёсцы Волма Дзяржынскага раёна. Арганізатарамі сапраўднага свята для ветэранаў вайны і працы сталі грамадскае аб'яднанне «Беларускі саюз жанчын», Беларускае радыё, асацыяцыя «Белсадгадавальнік» пры падтрымцы міжнароднай грамадскай арганізацыі «Дыялог Еўразія». Удзельнікі акцыі пасадзілі алею фруктовых дрэў, а галоўныя героі мерапрыемства атрымалі прыемныя сувеніры і салодкія падарункі.

■ Інтэграцыя

# ЗРОБЛЕНА Ў ЕАЭС

**Праект Асноўных напрамкаў прамысловага супрацоўніцтва ў Еўразійскім эканамічным саюзе цяпер праходзіць экспертызу ў ЮНІДО (Арганізацыя Аб'яднаных Нацый па прамысловым развіцці).**

Пра гэта паведаміў член Калегіі (міністр) па прамысловасці і аграпрамысловым комплексе ЕЭК Сяргей Сідорскі. Раней праект дакумента Еўразійская эканамічная камісія вынесла на публічнае абмеркаванне. Падобны вопыт — першы ў інтэграцыйным аб'яднанні на постсавецкай прасторы. Дакумент носіць сістэмны характар і разлічаны на сярэднетэрміновую перспектыву — 5 гадоў.

«Мы вызначылі 19 прыярытэтных галін у прамысловай палітыцы, якія ўвайшлі ў наш праект. Зараз ён праходзіць экспертызу ў ЮНІДО. Мы ў найбліжэйшы час плануем скончыць працэдуру ўзгаднення дакумента», — адзначыў Сяргей Сідорскі.

Дакумент арыентаваны на рашэнне такіх задач, як імпартазамяшчэнне прамысловых тавараў з трэціх краін на агульным рынку ЕАЭС за кошт павелічэння ўзаемных паставак прадукцыі дзяржаў-членаў нароўні з імпартазамяшчэннем уласнай прадукцыяй, якая пастаўляецца на свае нацыянальныя сегменты агульнага рынку; павелічэнне дабаўленай вартасці вытворчасці за кошт выкарыстання такіх кампанентаў, як сыравіна, матэрыялы, камплектуючыя і тэхналагічныя аперацыі як партнёраў па ЕАЭС, так і сваіх нацыянальных; нарошчванне экспарту прадукцыі апрацоўчай прамысловасці за кошт рэалізацыі сумесных дзеянняў дзяржаў — членаў ЕАЭС па яго падтрымцы; паскарэнне тэхналагічнага развіцця прамысловых комплексаў дзяржаў-членаў за кошт фарміравання сумеснай інавацыйнай інфраструктуры ў ЕАЭС.

Акрамя гэтага, ЕЭК плануе на працягу 1-2 гадоў зацвердзіць маркіроўку «Тавар Мытнага саюза». «Мы абмяркоўваем магчымасць вытворчасці ў нас, у ЕАЭС, прадукцыі, якая б маркіравалася «Тавар Мытнага саюза» або «Зроблена ў ЕАЭС». Такі тавар будзе адпавядаць нашым рэгламентам і бесперашкодна перамяшчацца па тэрыторыі Мытнага саюза», — растлумачыў Сяргей Сідорскі.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■


**Доопубликация к информации, опубликованной в газете «Звязда» №56 от 25 марта 2015 г.**

**ИНФОРМАЦИЯ**
**об открытом акционерном обществе**
**«Универмаг «Солигорск»**
**и его деятельности по состоянию на 01 января 2015 г.**

Полное наименование, включая организационно-правовую форму – Открытое акционерное общество «Универмаг «Солигорск»
УНП 600024725, по ОКПО 02129235, по ОКЭД 52120, по ОКОНХ 71211
Местонахождение эмитента – 223710, Минская обл., г. Солигорск, ул. Ленина, 39, тел./факс (80174) 24 79 26

| | |
|---|---|
| Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %): | 99,0737 |

| Вид собственности | Количество акций, шт. | Доля в уставном фонде, % |
|---|---|---|
| Коммунальная всего: | 1747278 | 99,0737 |
| В том числе: районная | 1747278 | 99,0737 |

**Информация о дивидендах и акциях:**

| Показатель | Единица измерения | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 125 | 125 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 1 | 1 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 0 | 0 |
| в том числе: физических лиц | лиц | 124 | 124 |
| Из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 0 | 0 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | миллионов рублей | 188,6 | 186,49 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | миллионов рублей | 186,0 | 96,0 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | 106,94 | 105,74 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги) | рублей | 106,94 | 105,74 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | тысяч рублей | 20,39 | 20,37 |
| Количество простых акций находящихся на балансе общества | штук | 0 | 0 |

Отдельные финансовые результаты деятельности:

| Показатель | Единица измерения | С начала года | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | миллионов рублей | 133343,00 | 142512 |
| Себестоимость реал. продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию | миллионов рублей | 133140,00 | 141927 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения, всего | миллионов рублей | 871,0 | 706,0 |
| в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | миллионов рублей | 203,0 | 585,0 |
| в том числе: прочие доходы и расходы по текущей деятельности | миллионов рублей | -28,00 | -217,00 |
| в том числе: прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | миллионов рублей | 696,00 | 338 |
| Налог на прибыль: изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | миллионов рублей | 188,00 | 212 |
| Чистая прибыль (убыток) | миллионов рублей | 683,0 | 494,0 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | миллионов рублей | 3758,00 | 3717 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | миллионов рублей | 0,00 | 0,00 |
| Долгосрочные обязательства | миллионов рублей | 0,00 | 0,00 |
| Среднесписочная численность работающих | человек | 418 | 453 |

Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: розничная продажа в неспециализированных магазинах пищевыми продуктами, включая алкогольные напитки; прочая торговля в неспециализированных магазинах.
Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: 24 марта 2015 г.
Сведения о применении эмитентом свода правил корпоративного поведения: принять к сведению.

# ЛЕТА ТАННЫХ КВАТЭР



**(Заканчэнне.**
**Пачатак на 1-й стар.)**

Не вельмі якасныя кватэры ў Шабанах, Курасоўшчыне або ў зусім «свежай» новабудоўлі магчыма знайсці цяпер і за 220-250 долараў (3,15-3,6 млн рублёў). Гэта таксама немаленькія грошы, але іх у Мінску магчыма зарабіць.

**На працягу двух першых месяцаў года ў сталіцы назіраліся масавыя «пераезды» арандатараў.**

Цяпер цалкам «упакаваныя» сучаснай мэбляй і бытавой тэхнікай аднапакаёвыя кватэры нават у цэнтры горада маюць цэннік ад 350 да 400 долараў. Яшчэ летась падобнае жыллё каштавала ў дыяпазоне ад 500 да 600 долараў.

## СЛАБЕНЬКІЯ ДВУХПАКАЁЎКІ — 300 ДОЛАРАЎ

У апошнія два-тры тыдні на рынку доўгатэрміновай арэнды ў Мінску часам пачалі з'яўляцца бюджэтныя варыянты двухпакаёвых кватэр па кошце ад 300 долараў. Гэта звычайна невялікія «хрушчоўкі» са старой мэбляй або ўвогуле пустыя. Самы запатрабаваны ў кліентаў дыяпазон коштаў на падобныя кватэры вагаецца ад 300 да 350 долараў. Зразумела, што гэта будзе сціплае жыллё, але менавіта на такія кватэры цяпер існуе ўпэўнены попыт. Сярэдні кошт сапраўды якасных двухпакаёвых кватэр у спальных раёнах ці звычайных двушак у цэнтры складае ад 350 да 500 долараў. Спецыялісты адзначаюць, што за 500 долараў сёння прапануецца элітнае жыллё. Аднак на яго попыт цяпер мінімальны.

У самае складанае становішча трапілі ўладальнікі трохпакаёвых і шматпакаёвых кватэр. Прапанова гэтага сегмента з пачатку года павялічылася найбольш, а попыт нават крыху знізіўся. Цяпер сярэдні кошт такіх кватэр складае ад 350 да 450 долараў. Атрымліваецца, што часам гаспадары шматпакаёвак вымушаны здаваць сваё прасторнае жыллё па кошце двухпакаёвак. Калі цэннікі на трохпакаёўкі не зніжаюцца, гэтае жыллё на працяглы час застанецца пустым.

## ПАТАННЕННЕ ПРАЦЯГНЕЦЦА ДА ВОСЕНІ

Эксперты рынку жыллёвай арэнды паведамляюць, што сёння ў гэтай сферы працягваецца карэкціроўка цэннікаў, аднак адбываецца падобнае патанненне ў больш спакойным становішчы. Так здарылася, што асобныя гаспадары яшчэ зімой істотна знізілі свае кошты і больш на гэты конт не турбуюцца. Астатнія згаджаюцца з працяглай тэндэнцыяй і памяншаюць свае апетыты. Нейкай ажыятажнай нервознасці на рынку ўжо няма. Сёння амаль усе адэкватныя гаспадары жылля разумеюць, што максімальны кошт стандартнай аднапакаёвай кватэры не можа быць больш за 350 долараў, а двухпакаёвай — больш за 400 долараў. З гэтым усё зразумела. Цяпер удакладняюцца мінімальныя кошты ў гэтых сегментах арэнды жылля. Магчыма, што цанавое дно па аднапакаёвых кватэрах якраз і акрэсліваецца цэннікам у 250-300 долараў, аднак спецыялісты ў гэтым яшчэ не ўпэўнены.

Менавіта цяпер з рынку арэнды пачынаюць сыходзіць студэнты апошніх курсаў, якія атрымалі размеркаванне ў другія рэгіёны. А на іх месца новыя арандатары яшчэ не прыйшлі. Часткова знікненне такіх кліентаў летам кампенсуе павелічэнне ў сталіцы сезонных работнікаў будаўнічых аб'ектаў і рынкаў. Аднак сёлета назіраецца памяншэнне даходаў у гэтай сферы дзейнасці.

Магчыма, што пэўны штуршок да ажыўлення рынку жыллёвай арэнды ў Мінску зробяць новыя першакурснікі. А яны з'явяцца ў сталіцы ў сярэдзіне жніўня. Мяркуецца, што падобнае ажыўленне працягнецца і ў верасні. Разам з тым, свабоднага жылля (здымных прыватных кватэр і пакояў у інтэрнатах) у Мінску дастаткова. Таму кошты на прыватную арэнду нават у жніўні павялічвацца не павінны, лічыць Алена Агрызка.

**Не вельмі якасныя кватэры ў Шабанах, Курасоўшчыне або ў зусім «свежай» новабудоўлі магчыма знайсці цяпер і за 220-250 долараў.**

Другім фактарам, які паўплывае на актыўнасць рынку арэнды, з'яўляецца сітуацыя на другасным рынку жылля. Цяпер, паводле інфармацыі партала Realt.by, індэкс даходнасці арэнды носіць ілюстрацыйны характар. Купляць тыпавую аднапакаёвую кватэру ў панэльным доме, каб здаваць яе за 250-300 долараў за месяц, як мінімум, непрадбачліва, ведаючы, што толькі за адзін красавік яе кошт на рынку продажу знізіўся адразу на 1,5-2 тысячы долараў. Патэнцыйныя інвестары звернуць увагу на рынак арэнды толькі пасля таго, як цэны на кватэры ў Мінску перастануць зніжацца. А вось калі гэта адбудзецца, не ведае пакуль ніхто.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ■ Факт

## ОРДЭН ДЛЯ МАЦІ

**Заўтра, у міжнародны Дзень сям'і, 16 шматдзетных мінчанак будуць узнагароджаны ордэнам Маці. Урачыстая цырымонія пройдзе ў Мінскай гарадской ратушы.**

Цяпер гэтай узнагароды ўдастоены 499 жыхарак сталіцы, якія нарадзілі і дастойна выхавалі пяцярых і больш дзяцей. Летась ордэнам Маці былі ўзнагароджаны 28 мінчанак.

Штогод у сталіцы колькасць шматдзетных сем'яў павялічваецца ў сярэднім на тысячу. Сёння на ўліку ў органах сацыяльнай абароны Мінска знаходзяцца амаль 10,2 тысячы шматдзетных сем'яў. За апошнія 5 гадоў іх колькасць павялічылася на 4,6 тысячы, або на 83,7%.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

## І КРЭДЫТЫ ЎЖО НЕ САКРЭТ

**Айчынныя фінансавыя ўстановы будуць прадастаўляць падатковым органам звесткі, якія паведамляюцца ў крэдытнай гісторыі, а таксама даныя аб продажы за беларускія рублі замежнай валюты і плацежных дакументаў у замежнай валюце. Пра гэта гаворыцца ў пастанове Міністэрства па падатках і зборах і Нацыянальнага банка Беларусі №10/258 ад 29 красавіка 2015 года, якое было апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.**

Дакументам вызначаецца пералік звестак, што складаюць банкаўскую таямніцу фізічных асоб і якія банкі, нябанкаўскія крэдытна-фінансавыя арганізацыі будуць прадастаўляць, пры неабходнасці, падатковым службам на падставе пагаднення, заключанага з Міністэрствам па падатках і зборах. Агучаная пастанова ўступае ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## СВЯТА СЯБРОЎ КНІГІ

**Адбудзецца заўтра ў Гродне.**

Каб папулярызаваць сямейнае чытанне ў дзіцячай бібліятэцы №6 падрыхтавалі віншавальна-забаўляльную праграму для сем'яў, дзе тата ці мама, бабуля ці дзядуля разам з дзецьмі альбо ўнукамі наведваюць бібліятэку ў сваім мікрараёне, удзельнічаюць у яе мерапрыемствах, пастаянна бяруць на дом кнігі і часопісы. Кожная сям'я атрымае падзячны ліст ад Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы г. Гродна і невялікі падарунак.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## БОЛЬШ ЗА 300 ГАДОЎ СТАЖУ

**У Брэсцкім абласным аб'яднанні прафсаюзаў ушанавалі прадстаўнікоў 15 дынастый настаўнікаў.**

Найбольшы педагагічны стаж аказаўся ў Секяржыцкіх. Прадстаўнікі гэтага сямейства ў суме напрацавалі 348 гадоў! Цяпер ужо выкладчыкі трэцяга і чацвёртага пакаленняў сям'і працуюць у Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. С. Пушкіна. А вось нашчадкі Ерафея Клімава расказалі пра свайго прадзеда, які яшчэ ў XIX стагоддзі арганізаваў школу для вясковых дзяцей і стаў выкладаць у ёй. Сямейная традыцыя станавіцца настаўнікамі захавалася ў Клімавых да гэтай пары. Прадстаўнікі дынастый педагогаў атрымалі падарункі і незабыўныя ўражанні.

**Яна СВЕТАВА.**

## ■ Абітурыент–2015

# Хто пройдзе ў ВНУ без экзаменаў?

У 2015 годзе права быць залічанымі без здачы ўступных іспытаў у вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы будуць мець пераможцы 11 міжнародных алімпіяд і турніраў. Днямі Міністэрства адукацыі вызначылася з іх пералікам. У яго ўвайшлі Міжнародныя: 56-я матэматычная алімпіяда (Тайланд), 49-я Мендзялееўская алімпіяда школьнікаў па хіміі (Арменія), 47-я хімічная алімпіяда (Азербайджан), 46-я фізічная алімпіяда (Індыя), 27-я алімпіяда па інфарматыцы (Казахстан), 26-я біялагічная алімпіяда (Данія), 12-я геаграфічная алімпіяда (Расія), 9-я алімпіяда па астраноміі і астрафізіцы (Інданезія), а таксама 4-я Еўрапейская матэматычная алімпіяда для дзяўчат (Беларусь), алімпіяда школьнікаў Саюзнай дзяржавы па рускай мове і рускай літаратуры «Расія і Беларусь: гістарычнае і духоўнае адзінства» (2014 год, Расія), 8-я Міжнародная алімпіяда навук аб Зямлі (IESO) (Іспанія).

Без здачы цэнтралізаванага тэсціравання змогуць паступаць абітурыенты, якія атрымалі на гэтых алімпіядах дыпломы I, II і III ступеняў.

Нагадаем таксама, што без экзаменаў паступаюць і пераможцы рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, праведзенай у бягучым навучальным годзе (уладальнікі дыпломаў I, II і III ступеняў), пры ўмове паступлення на спецыяльнасці, для якіх дадзены прадмет устаноўлены прадметам першага профільнага іспыту.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Утерянные полисы страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу форму 2РП, 2РН серии БА №№ 0795352, 0795353, 0795354, 0795355, 0795356 **считать недействительными.**

УНП 100357923

## ООО «БИТ-Брокер Групп»

Учетный номер плательщика: 806000365
Вид экономической деятельности:
посредническая страховая деятельность
Организационно-правовая форма: частная
Орган управления: общее собрание участников Общества
Единица измерения: млн.руб.
Адрес: 223044 Минский район, д. Касынь

**www.bit-broker.by**

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2014 года

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 декабря 2013 г. | На 31 декабря 2012 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **-** | **-** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 46 | 40 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 355 | |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **401** | **40** |
| **БАЛАНС** | **300** | **401** | **40** |

| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | Код строки | На 31 декабря 2013 года | На 31 декабря 2012 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 348 | 10 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | - | (18) |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **348** | **(8)** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **-** | **-** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 39 | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 14 | 48 |
| В том числе: | | | |
| по налогам и сборам | 633 | 1 | 5 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 4 | 17 |
| по оплате труда | 635 | 9 | 25 |
| прочим кредиторам | 638 | | 1 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **53** | **48** |
| **БАЛАНС** | **700** | **401** | **40** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – декабрь 2014 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь–декабрь 2014 года | За январь–декабрь 2012 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 371 | 61 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (356) | (79) |
| Валовая прибыль (010 – 020) | 030 | 15 | (18) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050) | 060 | 15 | (18) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080) | 090 | 15 | (18) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 4 | - |
| В том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 4 | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (1) | - |

| Наименование показателей | Код строки | За январь–декабрь 2014 года | За январь–декабрь 2012 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| В том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (1) | - |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100 - 110 + 120 - 130) | 140 | 3 | - |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140) | 150 | 18 | (18) |
| Чистая прибыль (убыток) (± 150 – 160 ± 170 ± 180 – 190 – 200) | 210 | 18 | (18) |
| Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230) | 240 | 18 | (18) |

**Руководитель** **Т.В. Левкевич**

**Главный бухгалтер** **И.И.Зеленковский**

## Извещение о проведении 28 мая 2015 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | «Административное помещение №2Н» с инвентарным номером 500/D-77361 общей площадью 55,1 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Максима Богдановича, д. 37, пом. 2Н (назначение: административное помещение) |
| **Продавец имущества** | ОАО «Белагропромбанк», пр-т Жукова, 3, 220036, г. Минск |
| **Организатор торгов** | УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к.10 |
| **Начальная цена предмета торгов (с учетом НДС)** | 93 670 долларов США |
| **Сумма задатка** | 140 000 000 белорусских рублей |
| **Условие торгов (условие продажи)** | 1. Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.<br>2. Победитель торгов (покупатель) оплачивает стоимость предмета торгов, определенную по результатам аукциона, в белорусских рублях по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь на день перечисления денежных средств на счет продавца в срок, определенный договором купли-продажи предмета торгов, с учетом внесенной суммы задатка. |

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся **28 мая 2015 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 15.05.2015 по 26.05.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»); (017)229-65-51 (ОАО «Белагропромбанк»).**

■Таямніцы прафесіі

# Паказальны дэтэктыў

**Шакіраваць і здзіўляць супрацоўнікі ўпраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Гомельскай вобласці пачалі непасрэдна з увахода. У дзень адчыненых дзвярэй на газоне перад будынкам маляўніча расклалі два манекены.**

Бутэлькі, недакуркі, рэчы і сякера пераконвалі, што мы трапілі на месца здарэння, дзе нядаўна было высвятленне міжасобасных адносін. Напэўна, бурнае. Вось такая імітацыя сцэнкі са штодзённага працоўнага жыцця судмедэкспертаў. Тут яны самі выйшлі на першы план і пачалі дэманстраваць, як збіраецца інфармацыя, якая ў крымінальнай справе потым будзе называцца рэчавымі доказамі.

Транспарт, на якім крыміналіст і судовы медык прыязджаюць на месца здарэння, укамплектаваны вельмі рознымі прыладамі. Фотаапарат — абавязкова. Акрамя зусім спецыфічных і мудрагелістых, знайшлося месца стамескам, адвёрткам, перфаратару, рыдлёўцы, веніку, шуфліку, пінцэтам, слоіку з гіпсам... Сляды спермы дапаможа знайсці ўльтрафіялетавы ліхтар.

Калі ўлічыць, што ўсімі гэтымі рэчамі даводзіцца пастаянна карыстацца, рамантызм прафесіі, створаны тэледэтэктывамі, даволі ўмоўны. Публічна эксперты паварочвалі «нежывыя целы», разглядалі нанесеныя «раненні» і разважалі над даўнінай трупных плямаў. Збіралі рознае смецце вакол, у якім знаходзілі, напрыклад, недакуркі, якія могуць утрымліваць клеткі эпітэлію, што абавязкова спатрэбіцца для далейшай ідэнтыфікацыі магчымага злачынцы.

Акрамя адбіткаў пальцаў, якія знімаюцца спецыяльнымі парашкамі не толькі чорнага, але і белага колераў, эксперты цяпер бяруць і ўзор паху. Пры нас — з сякеры, якая па версіі стваральнікаў спецыфічнага шоу, была прыладай забойства. Для гэтага тапарышча абматалі бавоўнянай тканінай, пасля — фольгай. Пах тканіна забірае прыкладна за паўгадзіны, пасля чаго яе спакоўваюць у слоік, каб адправіць у Мінск, у сховішча пахаў.

Важнай знаходкай стаў след ад абутку. Яго эксперт заліў гіпсавым растворам гушчыні смятаны 15-працэнтнай тлустасці і атрымаў злепак падэшвы бота.

У экспертным «арсенале» ёсць самыя розныя металашукальнікі. Напрыклад, адзін з іх здольны падняць да 50 кілаграмаў. Звычайна ім шукаюць зброю на дне вадаёма ці ў калодзежы. Ёсць прылада для пошуку каляровых металаў, магнітныя граблі. Як бы мне такія спатрэбіліся, калі шукала ключы ад машыны, згубленыя на дачнай тэрыторыі.



Працуюць медэксперты.



По асаблівасцях траўмы спецыялісты з вялікай верагоднасцю могуць сказаць, ад чаго чалавек загінуў.

У экспертна-лабараторным корпусе вузкія спецыялісты праводзілі кансультацыю, як адрозніць сапраўдныя купюры ад падробленых. Іншыя адказвалі на пытанні наконт усталявання бацькоўства. Расказвалі, як грамадзянка прыводзіла па чарзе трох прэтэндэнтаў, апошні з якіх усё ж такі аказаўся бацькам яе дзіцяці. За мінулы год гомельскія эксперты правялі каля тысячы аналагічных экспертыз. Два з кожных дзесяці тэарэтычных «татаў» насамрэч імі не былі.

Толькі летась супрацоўнікі Камітэта судовых экспертыз па Гомельскай вобласці правялі 45 тысяч экспертыз і 7,5 тысячы даследаванняў. Цяпер у апараце Гомельскага ўпраўлення працуюць каля 500 чалавек, якія прадстаўляюць больш за 40 самых розных прафесій. Начальнік упраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Гомельскай вобласці Вячаслаў Блізнец адзначае, што кола дзейнасці структуры пастаянна пашыраецца:

— Цяпер, напрыклад, мы можам рабіць таваразнаўчыя экспертызы і многія іншыя — больш за 40 відаў. Праводзім даследаванні па псіхатропных рэчывах. Трапляе да нас зброя, у тым ліку часоў Вялікай Айчыннай вайны. Нашым спецыялістам даводзілася высвятляць асобу загінулага салдата, калі ў Жлобінскім раёне было знойдзена пахаванне. Па інфармацыі салдацкага медальёна ўстанавілі чалавека, які нарадзіўся ў Палтаўскай вобласці. Яго сваякі прыязджалі потым на ўрачыстае перапахаванне.

Ад чаго наступіла смерць, эксперты з вялікай доляй верагоднасці могуць сказаць, нават калі чалавек загінуў 850 гадоў таму. Менавіта такім узростам датаваўся самы стары чэрап, з якім давялося працаваць гомельскім спецыялістам. Свае асаблівасці маюць пашкоджанні на касцях.

— Напрыклад, пры наездзе аўтамабіля косць чалавека ламаецца пэўным чынам, — адзначае начальнік аддзела медыка-крыміналістычных экспертыз Міхаіл Чарнякоў. — Дзякуючы гэтаму эксперт можа вызначыць становішча ахвяры ў момант ДТЗ.

Намеснік начальніка ўпраўлення Следчага камітэта па Гомельскай вобласці Юрый Дзям'янчык гаворыць, што зараз без спецыялістаў камітэта судовых экспертыз іх штодзённая дзейнасць была б проста немагчымай:

— Калі ідзе збор доказаў па крымінальнай справе, вялікая роля надаецца рабоце з рэчавымі доказамі. Пасля ўтварэння камітэта наша ўзаемадзеянне стала больш цесным. Скараціліся тэрміны правядзення экспертыз, палепшылася якасць асобных даследаванняў. Вядома ж, чым хутчэй праводзіцца экспертыза, тым хутчэй раскрываецца крымінальная справа і прымаецца па ёй законнае рашэнне.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара**


## УЗДЕНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
**16 июня 2015 года по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 309 (3-й этаж) в 10.00 проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков**

НА АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ВЫСТАВЛЯЮТСЯ УЧАСТКИ:

| № лота | Арендодатель | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (бел. руб.) | Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Узденский райисполком | п. Смолзавод, участок № 1 | 0,7578 | 625684210601000022 | 60 645 524 | 17 413 090 |
| Лот № 2 | Узденский райисполком | п. Смолзавод, участок № 2 | 1,3113 | 625684210601000023 | 76 086 793 | 20 970 840 |
| Лот № 3 | Узденский райисполком | п. Смолзавод, участок № 3 | 0,8457 | 625684210601000024 | 50 811 564 | 15 903 450 |

Целевое назначение участка № 1 – для строительства объекта по обслуживанию населения (для размещения объектов общественного питания), участков №№ 2, 3 – для строительства производственного объекта (для размещения объектов промышленности). Инженерные коммуникации отсутствуют. Срок аренды участков – 50 лет.

НА АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОВТОРНО ВЫСТАВЛЯЮТСЯ УЧАСТКИ:

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (бел. руб.) | Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 4 | Узденский райисполком | г. Узда, ул. Новицкого (№73 по ПДП) | 0,1985 | 625650100001000581 | 117 111 824 | 11 982 771 |
| Лот № 5 | Узденский райисполком | г. Узда, ул. Новицкого (№68 по ПДП) | 0,1996 | 625650100001000582 | 117 760 806 | 11 661 815 |

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания многоквартирного жилого дома (для размещения объектов многоквартирной жилой застройки). Инженерно-техническое обеспечение земельного участка отсутствует. Срок аренды участка – 99 лет.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) производится в течение 10-ти рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: **г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 206, с $8^{00}$ до $17^{00}$ по рабочим дням по 11 июня 2015 года включительно.**

Заключительная регистрация – с $8^{30}$ до $9^{45}$ в день проведения аукциона.

Участники аукциона должны представить следующие документы:

• заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

• документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц представляют документ, удостоверяющий личность, а также копии документов о государственной регистрации ИП, юридического лица, копии учредительных документов, представителем или уполномоченным должностным лицом – нотариально удостоверенная доверенность (для уточнения правильности оформления необходимого пакета документов обращаться по телефону 8 (01718) 65338).

*Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет 3600631002518 Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области в ЦБУ №625 филиала №500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО 153001601, УНП 600537220, код платежа на право заключения договора аренды земельного участка – 04002.* Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для аренды на аукционе путем выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: **www.uzda.minsk-region.by, либо по телефонам (801718) 65404, 54705, 65338.**


# Падзяліся культурай з сябрам

## «Травіяту», якую выконвалі нашы артысты, кітайцы слухалі стоячы

**У кітайскай сталіцы «на ўра» прайшлі Дні беларускай культуры. І гэта ўлічваючы тое, што афішы Пекіна багатыя на артыстаў з усяго свету. Праграма пачалася 7 мая, перад візітам Старшыні КНР у Беларусь. Беларускі «культурны дэсант» узначаліў наместнік міністра культуры Васіль ЧЭРНІК, ён і падзяліўся ўражаннямі ад паездкі:**

— Мы пацікавіліся ў кітайскага боку, што б яны хацелі бачыць на сваёй тэрыторыі і атрымалі пажаданне, каб у складзе нашай дэлегацыі быў творчы калектыў, які выконвае народныя песні і танцы, а таксама артысты оперы і балета. Складана вывезці ў Кітай цэлы тэатр, таму было прынята рашэнне, што ў Днях культуры прыме ўдзел Беларускі дзяржаўны ансамбль народнай музыкі «Свята» і салісты нашага тэатра оперы і балета — заслужаная артыстка Ніна Шарубіна, саліст Павел Пятроў, балетная пара (народны артыст Ігар Артамонаў і зорка нашай балетнай трупы Яна Штангей). Акрамя таго, у цэнтры Пекіна, у Музеі дзяцей і мацярынства, арганізавалі выставу «Пэндзаль сяброўства» беларускай мастачкі Марыны Эльяшэвіч, якая працуе ў стылі кітайскага жывапісу гохуа. Тут прадстаўлена дваццаць чатыры работы — партрэты вядомых пісьменнікаў, прырода Беларусі, нашы гарады. Адкрыццё прайшло выдатна, выстава будзе доўжыцца да канца мая.

***— Што выконвалі нашы артысты?***

— Адажыа з «Лебядзінага возера» і па-дэ-дэ з балета «Дон Кіхот». Салісты оперы выканалі фрагменты з «Травіяты» Джузэпэ Вердзі і «Сілы лёсу» Імрэ Кальмана. Ансамбль «Свята» нават выканаў некаторыя народныя кітайскія песні, наместнік міністра культуры адзначыў добрую кітайскую мову.

Канцэрт адкрыцця доўжыўся паўтары гадзіны і праходзіў у адной з найзнакамітейшых залаў Beijing Concert Hall, якая змяшчае каля дзвюх з паловай тысяч чалавек — яна была поўнай. Яшчэ адзін канцэрт праходзіў ужо ў меншай зале, якая магла змясціць каля тысячы чалавек і таксама была запоўненай. Усё прымалася «на ўра». Пляскалі ў далоні, ускоквалі на «Лебядзіным возеры», на «Травіяце» ўсталі. А калі ансамбль «Свята» запеў на кітайскай мове — гэта было для іх незвычайна добрым уражаннем.

***— Па-за межамі Дзён культуры што-небудзь з беларускага мастацтва яшчэ паказваецца ў Кітаі?***

— Так, зараз праходзяць гастролі Дзяржаўнага ансамбля танца, працуе выстава Гістарычнага музея, прысвечаная дыпламату Іосіфу Гашкевічу. У нас ёсць дамоўленасць з пасольствам Беларусі ў Кітаі аб арганізацыі выставы, прысвечанай 70-годдзю Вялікай Перамогі і 70-годдзю разгрому Чырвонай Арміяй японскай квантунскай арміі. Гэта будзе адзначацца ў верасні. Дэталі мы яшчэ абмяркоўваем, але хочам, каб выстава працавала каля двух месяцаў.

***— Што яшчэ запланавана на будучыню, што беларусы змогуць убачыць у найбліжэйшы час?***

— Ужо рыхтуюцца Дні культуры Кітая ў нашай краіне, якія запланаваны на кастрычнік. Пакуль што вядома толькі пра ўдзел Пекінскага народнага мастацкага тэатра. Плануюцца дні кітайскага кіно. Дарэчы, у рамках створанага беларуска-кітайскага міжурадавага камітэта па супрацоўніцтве існуе і камісія па культуры, яе першае пасяджэнне адбудзецца якраз падчас Дзён культуры Кітая ў Мінску.

***— Якія дамоўленасці былі дасягнуты падчас вашага візіту ў Кітай?***

— Кітайскі бок хоча, каб мы да іх прывозілі больш выстаў, каб прыязджалі калектывы народнага мастацтва, каб нашы майстры народнай творчасці ўдзельнічалі ў іх мерапрыемствах. У 2016-м у адным з кітайскіх гарадоў будзе праходзіць Фестываль нематэрыяльнай культурнай спадчыны — мы ўжо атрымалі афіцыйнае запрашэнне прыняць у ім удзел. Дні беларускага кіно адбудуцца таксама не раней, чым у 2016 годзе, нас папрасілі скласці спіс фільмаў. Было агучана пажаданне правесці ў Кітаі поўнамаштабныя гастролі нашага тэатра оперы і балета. Яны зацікаўлены ў лялечных тэатрах, у выступленнях ансамбляў «Харошкі», «Белыя росы».

Я заўважыў, што кітайцы з павагай адносяцца да ідэі культурнага супрацоўніцтва з Беларуссю. Адным з вынікаў візіту Сі Цзіньпіна ў Беларусь стала пагадненне аб стварэнні кітайскага культурнага цэнтра ў Беларусі і беларускага — у Кітаі. Праца над ажыццяўленнем гэтай ідэі ўжо пачалася. Думаю, наша супрацоўніцтва будзе развівацца больш дынамічна.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

■Ведай нашых!

# У ТУРЦЫЮ — ПА МЕДАЛЬ

**У Стамбуле прайшла XXIV Міжнародная выстава даследчых праектаў школьнікаў. Мэта мерапрыемства — матывацыя таленавітых школьнікаў да навукова-даследчай дзейнасці.**

Асноўныя патрабаванні, што прад'яўляюцца да работ удзельнікаў, — арыгінальнасць і прымяненне даследчых методык на практыцы.

У гэтым годзе Беларусь прадстаўляла навучэнка 8 класа гімназіі № 1 г. Жодзіна Аляксандра Кахавец са сваёй работай «Упакоўка — каштоўны другасны рэсурс» (навуковы кіраўнік дзяўчыны — настаўніца геаграфіі Ірына Мікалаеўна Пічугіна).

Кампетэнтнае журы, у склад якога ўвайшлі выкладчыкі Стамбульскага ўніверсітэта, высока ацаніла даследчы праект беларускі. Аляксандра была ўдастоена медаля навуковага журы сярод замежных праектаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

Сямейная газета
Выпуск № 7 (30)


Фота Надзеі БУЖАН.

## ЦАНІЦЕ ТОЕ, ШТО ЗАСЛУЖЫЛІ

Колькі разоў вам рабілі прапанову рукі і сэрца? Што тычыцца мяне, то ўжо збілася з ліку. Праўда, усе прапановы, акрамя адной, сыходзілі ад сваякоў патэнцыйных жаніхоў. Так, як гэта ні камічна гучыць, саміх прэтэндэнтаў на мае руку і сэрца я не бачыла. Але затое пачула пра іх столькі, што такое адчуванне, быццам ведаю не адзін дзясятак гадоў. Усе, як адзін, добрыя, разумныя, багатыя, але пры ўсім гэтым (парадокс!) адзінокія... Вось, напрыклад, у апошняга — два гаражы, прасторная кватэра з сучасным рамонтам у цэнтры Мінска. «Што яшчэ трэба для шчасця?» — рэкламуе свайго пляменніка чарговая сваха. І дадае: «Толькі з асабістым жыццём у яго нешта не складваецца. Паехаў у Амерыку па доўгі рубель. У гэты час жонка кінула-прамяняла яго на больш багатага і перспектыўнага. А ён жа ёй і кватэру падарыў, і машыну — як сыр у масле каталася». І такіх жанчын (ды і мужчын таксама), якія не ўмеюць цаніць тое, што маюць, вакол поўна. Дзіўная рэч: колькі чалавеку ні дай, яму ўсё роўна будзе мала: «гэта не так, тое не так». А тады атрымліваецца: маем — не беражом, страціўшы — плачам. Добра, вядома, калі інакш...

Я таксама, колькі сябе памятаю, трызніла старэйшым братам, які б мяне абараняў, хоць маю цудоўную малодшую сястрычку. Марыла пра вялікую шумную сям'ю, а нас у бацькоў толькі дзве. І ў школе, і ва ўніверсітэце з сяброўкамі абмяркоўвалі: колькі кожная з нас народзіць дзяцей. Тады я катэгарычна і без сумнення сцвярджала: у мяне будзе, як мінімум, трое. Мудрае ж жыццё пастаянна паказвае-даказвае, як важна навучыцца цаніць тое, што маеш. І цяпер на пытанне «колькі хочаш дзяцей?» адказваю: «Колькі Бог дасць!» Бо хто, як не Ён, лепш ведае, чаго ты заслугоўваеш.

Калі шчыра, для мяне вельмі нечаканай была прапанова «ўдачарыць» «Сямейную газету». З аднаго боку — адчуваеш удзячнасць за давер, з другога — разумееш, што «дзіця», а тым больш «чужое», — гэта вялікая адказнасць. Бачу, як перажывае за далейшы лёс «дачкі» яе маці — мая калега, якая дагэтуль адказвала за выпуск «Сямейнай газеты». Дастаткова сказаць, што, нават знаходзячыся ў дэкрэтным водпуску, за лічаныя дні да нараджэння свайго дзіцяці, Вікторыя Целяшук забягала і цікавілася: «Як яна, ці добра сябе адчувае, а, можа, патрэбна дапамога?» І па першай просьбе дапамагала і парадай, і справай. «Вось будуць у цябе свае дзеці, тады зразумееш», — кажа мне мая матуля, калі я чарговы раз незадаволена буркаю на яе заўсёднае «будзеш дома — скінь (у сэнсе патэлефануй), каб я спала спакойна». Мама ёсць мама, яна не можа не думаць, не перажываць, бо хоча для свайго дзіцяці толькі найлепшага. Я гэта разумею і вельмі радуюся Вікторынай падтрымцы, бо цалкам згодна з перакананнем дырэктара Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Наталлі Паспелавай: «У выхаванні дзіцяці павінны ўдзельнічаць усе сем'і, якія яму па-сапраўднаму дарагія: сям'я, якая нарадзіла, прыёмная і сям'я ўсынавіцеляў. Чым больш людзей любяць дзіця, тым яму лепш».

Сімвалічна і знакава для мяне тое, што гэта «ўдачарэнне» адбылося цяпер. Менавіта тады, калі прыйшла да ўсведамлення: я гатова і хачу стварыць сям'ю, бо сустрэла свайго чалавека. Таму першыя крокі ў нязведанае сямейнае жыццё буду рабіць разам з «Сямейнай газетай» і з вамі, дарагія чытачы. І інтуіцыя мне падказвае, што нас чакае надзвычай цікавае, напоўненае новымі адкрыццямі, падарожжа.

**Надзея ДРЫЛА.**

■ Пераадоленне

# ТРЫ ПЕРАМОГІ АДНОЙ СЯМ'І

## Падтрымка родных дапамагае справіцца з любымі дыягназамі...

**Многія людзі навучыліся ставіцца да хвароб па-філасофску. Аднак калі цяжка захварэе роднае дзіця, то ніякая філасофія не дапамагае. Адчай, страх і бяссілле ахоплівае бацькоў... У такія моманты проста неабходна надзея. Незвычайная гісторыя дружнай сям'і Даневых, хочацца верыць, падорыць яе бацькам, на долю якіх таксама выпалі нялёгкія выпрабаванні.**

### МІШКА

Яшчэ да вяселля Алена і Аляксандр марылі пра дзяцей. Абое выхоўваліся ў шматдзетных сем'ях, таму ніякія цяжкасці іх не стрымлівалі. Тым больш старэйшыя браты і сёстры Аляксандра ўжо мелі сваіх дзяцей, і малады чалавек проста мроіў пра спадчынніка. І калі Алена зацяжарала Мішкам, то муж, можна сказаць, насіў яе на руках.

Роды былі цяжкімі. Дзіця прыйшлося выцягваць з дапамогай вакууму. Праз гэта ў яго на цемечку ўтварылася вялікая гематома. Гэта парушыла кровазварот у галаве немаўляці. Так іх першынцу быў пастаўлены дыягназ «гідрацэфалія галаўнога мозга».

— Мы з мужам вырашылі, што не будзем афармляць сыну інваліднасць, — расказвае Алена. — Вырашылі зрабіць усё, каб дзіця стала здаровым.

Галава ў Мішкі стала расці хутчэй за цела. Хлопчык пакутаваў ад страшных галаўных боляў. Шмат крычаў і капрызіў днём і ноччу. Бясконцыя паездкі ў бальніцу на абследаванне, таблеткі і мазі забіралі ў маладых усе сілы.

— Дактары нам гаварылі, што, хутчэй за ўсе, Мішу спатрэбіцца выпампоўванне лішняй вадкасці з галавы з дапамогай спецыяльнай аперацыі, — успамінае Алена.— Я вельмі перажывала і плакала. І калі б не падтрымка мужа і родных, магчыма, зламалася б. Нашы медыкі чамусьці настройваюць бацькоў хворых дзяцей на самае дрэннае... Нам казалі, што Мішка, магчыма, ніколі не будзе хадзіць.

Тады маладыя жылі ў бацькоў Алены. Яны, бывала, ноччу забіралі Мішку да сябе і гэтым давалі маладым трошкі паспаць. Па сённяшні дзень Алена ўдзячна бацькам за дапамогу. Таксама з цеплынёй гаворыць пра свайго мужа, які, каб зберагчы ад стрэсаў жонку, на прыём да спецыялістаў вазіў сына адзін.

Праз год сітуацыя палепшылася. Цела Мішкі стала «даганяць» галаву. Цяпер яна перастала расці так хутка. Два гады таму дыягназ знялі. Хлопчыку зараз восем. У яго, бывае, баліць галава, звычайна прыступы з'яўляюцца восенню і вясной падчас напружанай вучобы ў школе, але ён п'е неабходныя лекі — і ўсё праходзіць.

### КІРА

Дзяўчынка нарадзілася здаровай. Здавалася, што яна прыйшла на гэты свет, каб прыносіць усім радасць і ўсмешкі. Вядома, вясёлая і жыццярадасная непаседа дастаўляла бацькам і клопаты, але яны былі прыемнымі: злавіць, каб пакарміць ці памыць малую. Бяда здарылася, калі дачцэ споўнілася тры гады. Тады сям'я Даневых з роднымі адпачывала на дачы. Дзяўчынка няўдала ўпала з веласіпеда і пашкодзіла галаву. Бацькі павезлі яе ў бальніцу на абследаванне. Энцэфалаграма галаўнога мозга паказала сутаргавы сіндром. Малая стала час ад часу заміраць. Напрыклад, збірае пазлы ці есць — і раптам спыніцца на некаторы час і не рухаецца, не рэагуе нават на свае імя.

— Від нерухомай дачушкі прыводзіў мяне ў адчай, — расказвае Алена. — Урачы настройвалі нас на магчымую эпілепсію. У мужа ад гэтай навіны здалі нервы, ён пачаў курыць. Памятаю, як Саша ўскокваў па начах і ішоў правяраць малых у ложках...

Пачаўся доўгі і вельмі дарагі курс лячэння. Бацькі і Алены, і Аляксандра падтрымлівалі маладых, як маглі. Яны былі гатовы прыйсці на дапамогу ноччу і днём. Алена адчувала, што іх сям'я, нягледзячы на выпрабаванні, нібыта моцна трымае адно аднаго за руку. Кожны хацеў аблегчыць хваляванне і клопат іншага. Неўзабаве ў маленькай прынцэсы прыступы сталі знікаць. Намаганні ўсёй сям'і далі свае вынікі. Сёння дзяўчынцы яшчэ не знялі дыягназ, але маці ўпэўнена, што гэта хутка адбудзецца. Кіра пайшла ў першы клас ужо без прыступаў. Бацькі ганарацца сваёй дачкой, яе поспехамі і ўменнем выстаяць у складаных сітуацыях.


Сям'я Даневых.

### ЮРА

Юра — самы маленькі ў сям'і. Яго нараджэнне можна было назваць хуткасным. Апоўначы ў Алены пачаліся роды, а ўжо праз гадзіну малы з'явіўся на свет. Яго адразу забралі, нічога не патлумачыўшы разгубленай маці. Толькі сказалі, што здарылася двухразовае тугое абвіццё пупавінай. Гэта быў самы жудасны тыдзень для Алены. Яна не знаходзіла сабе месца ў радзільным доме, дзіця жыло толькі пад кропельніцай. Самі дактары не ведалі, што з малым і як яму дапамагчы.

— Праз тыдзень урач сказаў, што малога пераводзяць у сёмы радзільны дом, — расказвае дрыготкім голасам жанчына. — А мне прапанавалі адмовіцца ад дзіцяці, маўляў, невядома, будзе ён жыць ці не. Для мяне гэта быў сапраўдны ўдар. У мяне з дзяцінства парок сэрца, памятаю, як мне тады зрабілася дрэнна... Не ведаю, адкуль у мяне амаль праз хвіліну ўзяліся сілы і смеласць, але я рашуча сказала ўрачам, што забіраю малога дадому.

**(Заканчэнне на 6-й стар. «СГ».)**

■ У вас будзе дзіця

*«ЗВЯЗДА» + АНТ*

**Ужо больш як тры гады на тэлеканале АНТ выходзіць рубрыка «У вас будзе дзіця» (у рамках праграмы «Пакуль усе дома», а з нядаўняга часу — і ў пятнічных выпусках праграмы «Наша раніца»). Стваральнікі беларуска-расійскага праекта дапамагаюць дзецям, якія засталіся без бацькоўскай апекі, адшукаць новыя сем'і. За гэты час 57 дзяцей ужо змянілі сцены дзіцячых дамоў на цяпло і ўтульнасць сямейнага ачага. «Звязда», якая летась далучылася да праекта, таксама працягвае знаёміць патэнцыйных усынавіцеляў і апекуноў з маленькімі героямі рубрыкі, якім трэба так многа і так мала — бацькоўскі клопат, пяшчота і любоў.**

## Мама для Сонейка

**6-гадовая Іра выхоўваецца ў Віцебскім дзіцячым доме. Як і большасць дзяўчат, яна любіць прыгожа апранацца і рабіць прычоскі, а яшчэ з задавальненнем клапоціцца пра тых, хто меншы за яе.**

«Іра — адзіная дзяўчынка ў групе, але без сяброўак яна не губляецца, прыцягваючы да гульняў хлопчыкаў: размяркоўвае ролі, тлумачыць кожнаму, што трэба рабіць, — расказвае педагог-дэфектолаг Жанна Рулёва. — Сама ж Іра ў гэтых гульнях — то клапатлівая мама, то ўважлівы і строгі ўрач у бальніцы...



Артыстызм і фантазію яна развівае таксама ў тэатральным гуртку. А падчас больш сур'ёзных заняткаў дзяўчынка праяўляе адказнасць, настойлівасць і самастойнасць: калі ўжо ўзялася за нейкую справу, то абавязкова давядзе яе да канца». Выхавальнікі называюць Ірынку «наша сонейка» і ўпэўнены, што, калі для дзяўчынкі знойдуцца новыя бацькі, яна абавязкова адплаціць тым за дабрыню пяшчотай і любоўю.

*Калі вы хочаце даведацца пра Іру больш, патэлефануйце спецыялістам Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі па нумары: (017) 284-71-51. Для тых, хто хоча ўсынавіць дзіця, на сайце videopassport.ru змешчаны відэакурсы, падрыхтаваныя сумесна НЦУ і творчай групай праекта.*

# ЦЁПЛЫ ПАКОЙ

## Малыя, якія недаатрымліваюць любові ў сям'і, часцей становяцца ахвярамі гвалту

**У 2012 годзе эксперты правялі даследаванне сярод нашай моладзі 18—26 гадоў, вынікі якога прымушаюць не задумацца, а біць ва ўсе званы. Звесткі, якія атрымалі даследчыкі, шакіруюць: 7% апытаных заявілі, што самай траўматычнай падзеяй іх дзяцінства быў сексуальны гвалт, амаль 25% цярпелі ад фізічнага гвалту і больш за 60% падвяргаліся эмацыйнаму. У 2013 годзе ў краіне зафіксавана амаль 400 злачынстваў супраць палавой свабоды дзяцей. Гэтую лічбу можна смела памнажаць на дзесяць, як сцвярджаюць спецыялісты, бо іх узровень прыкладна аднолькавы ва ўсіх краінах. У нас гэтая з'ява мае схаваны характар з шэрагу прычын: неэфектыўнасць сістэмы выяўлення, нізкая даступнасць экстраннай, ананімнай і якаснай псіхалагічнай дапамогі, сорам перад грамадствам. А яшчэ страх, што следства і суд стануць больш моцным ударам, чым само злачынства...**



Шкло-люстэрка, праз якое бачны дружалюбны да дзяцей пакой.

### ДРУЖАЛЮБНАЯ ГУТАРКА ПАД... ВІДЭАКАМЕРАЙ

Між тым каля 10% псіхічных расстройстваў у дзіцяці, над якім учынілі сексуальны гвалт, узнікаюць не ў выніку самога гвалту, а ў выніку траўматычнай працэдуры расследавання. Для таго, каб атрымліваць праўдзівыя паказанні падчас разбору крымінальных спраў, а таксама мінімалізаваць псіхалагічную траўму падчас следчых дзеянняў, у краіне з 2009 года існуюць дружалюбныя да дзяцей пакоі апытання. Малалетніх сведак ці ахвяр злачынстваў сюды прыводзяць следчыя органы і ў агульных рысах расказваюць спецыялістам-псіхолагам пра сітуацыю, якая здарылася.

— Перад намі ставяць задачу, што трэба высветліць у дзіцяці. А ўжо мы будзем гэта рабіць — існуе спецыяльная працэдура. Мы не проста размаўляем, у нас ёсць пэўны план гутаркі, — распавядае **эксперт-псіхолаг Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Наталля МАХНАЧ.** — Галоўнае, для чаго існуе пакой, — гэта стварэнне дружалюбнай для дзіцяці атмасферы, у якой яно можа раскрыцца і максімальна небалюча для сябе расказаць пра тое, што з ім адбывалася.

— Напрыклад, кажаш дзіцяці, што чула, быццам з ім нешта здарылася, і просіш расказаць пра гэта. Дэталі ўдакладняем, але не задаем наводзячых пытанні. У размове абапіраемся толькі на тое, што чуем, — запэўнівае **эксперт-псіхолаг Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Анжаліка НАЗАРАНКА.**

Першы дружалюбны пакой для апытання дзяцей — ахвяр гвалту і сведак злачынстваў быў створаны экспертамі міжнароднай грамадскай арганізацыі «Разуменне» ў 2009 годзе. Цяпер іх 17 (шэсць — у Мінску). З 2009 года праз пакоі дружалюбнага апытання прайшло 781 дзіця (паводле звестак на 1 студзеня 2015 года). Самаму маленькаму было менш за чатыры гады. Па падліках спецыялістаў, у Беларусі неабходна каля 50 такіх пакояў.

**З праблемай дзіцячага гвалту любога характару можна звяртацца па тэлефоне агульнанацыянальнай дзіцячай лініі: 8-801-100-1611.**

За апошні час раскрывальнасць злачынстваў супраць палавой свабоды дзяцей у Беларусі ўзрасла на 45% — дзякуючы якасным зменам следства ў адносінах да непаўналетніх ахвяр. Многія перастаюць баяцца заявіць пра здарэнне, у тым ліку, гэтаму паспрыялі апытанні дзяцей з удзелам псіхолагаў. Пакуль што апошняя праводзяцца на ўзроўні рэкамендацый Следчага камітэта. Аднак эксперты ўжо накіравалі ў парламент свае прапановы па зменах у Крымінальны і Крымінальна-працэсуальны кодэксы, дзе гаворыцца аб абавязковым аднаразовым апытанні следчымі органамі пацярпелага дзіцяці падрыхтаваным спецыялістам-псіхолагам у спецыяльным дружалюбным пакоі, абсталяваным відэакамерай.



Так ідзе кансультаванне на агульнанацыянальнай дзіцячай лініі дапамогі.

Фота Надзеі БУЖАН.

Спецыялісты падстройваюцца пад кожнае дзіця ў адпаведнасці з яго ўзростам, развіццём, а таксама сітуацыяй, якая здарылася. Не робіць са слоў ніякіх высноў, а стараюцца вывесці свайго маленькага суразмоўцу на максімальна свабодны і шчыры расповед. Усё, што адбываецца ў пакоі, здымае відэакамера. Пра гэта дзяцей папярэджваюць. Запіс вядзецца для таго, каб пасля можна было выкарыстоўваць яго ў працэсе следства і суда, не апытваючы дзіця дадаткова.

— Відэазапіс у многіх выпадках з'яўляецца вычарпальнай інфармацыяй для суда, і гэта дазваляе не траўмаваць дзіця зноў, не весці яго ў залу, дзе сядзіць злачынца, — тлумачыць Анжаліка Назаранка.

Але ёсць у такім пакоі яшчэ адна «хітрасць» — на адной са сценак усталявана шкло, якое выглядае, як люстэрка. А калі паглядзець у яго з суседняга пакоя, можна ўбачыць усё, што адбываецца падчас апытання. Такім чынам у той час, калі дзіця і псіхолаг размаўляюць, за гутаркай могуць назіраць іншыя зацікаўленыя: напрыклад, следчыя.

### СУМНЫ ВОПЫТ: З МІНУЛАГА Ў БУДУЧЫНЮ?

Даказана, што дзеці, у якіх не сфарміраваны даверлівыя адносіны з бацькамі, часцей становяцца ахвярамі сексуальнага гвалту. Малеча не можа супраціўляцца, бо, па-першае, дарослы чалавек — як правіла, аўтарытэт, якога трэба слухацца. А па-другое, у дзяцей яшчэ не выпрацаваны механізм супраціўлення, бо ўсё сваё жыццё чалавек вучыцца гаварыць «не». У той жа час яны павінны ведаць, што з любымі праблемамі могуць прыйсці да бацькоў. Асабліва давер важны ў падлеткавым узросце. Калі такіх адносін няма, ахвяры могуць гадамі не распавядаць пра тое, што з імі адбываецца.

— Дзяўчынка пасля таго, як яе згвалтавалі на вуліцы, прыйшла дадому, вымыла вопратку, у якой была, і села рабіць урокі. Яе выхоўвалі бацька і мачыха, з якой падчарыца ладзіла, але даверу не адчувала, — прыводзіць прыклад **начальнік аддзела псіхолага-фізіялагічных даследаванняў галоўнага ўпраўлення судова-псіхіятрычных экспертыз Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Людміла МУН.**

А вось ахвяры сямейнага гвалту нярэдка маўчаць праз страх помсты, праз няпоўнае ўсведамленне ўчыненых з імі дзеянняў, праз недавер да навакольных або боязь разбурыць сям'ю, у якой жывуць. Часам гвалтаўнік прымушае ахвяру маўчаць пераканнем ці пагрозамі. Пры гэтым, як адзначыла Людміла Мун, дзеці ў большасці выпадкаў хочуць расказаць пра тое, што здарылася, і знаходзяцца на мяжы таго, каб гэта зрабіць.

Напрыклад, іншая васьмігадовая дзяўчынка, якую згвалціў айчым, распавяла пра здарэнне адразу пасля яго. Паспрыяла гэтаму тое, што ў дом якраз зайшлі мама і старэйшая сястра. Дзяўчынцы паверылі, выклікалі міліцыю, Людміла Мун правяла апытанне. Аднак гвалтаўніку ледзь не ўдалося пазбегнуць пакарання: раптоўна маці дзяўчынкі адмовілася ад сваіх першапачатковых паказанняў. Справа ў тым, што айчым быў адзіным карміцелем у сям'і. Дзякуючы доказам, атрыманым падчас апытання, усё ж удалося прыцягнуць яго да адказнасці.

Адметна, што не толькі эканамічная залежнасць не дае жанчынам станавіцца на бок сваіх дзяцей. Ёсць розныя псіхалагічныя прычыны. Напрыклад, рэўнасць да дзіцяці як да сексуальнага канкурэнта, спроба пазбегнуць пачуцця віны (маўляў, недагледзела дачку). А яшчэ нярэдка маці трапляюць пад уплыў навакольных. Начальнік аддзела псіхолага-фізіялагічных даследаванняў прыгадала выпадак: у шматдзетнай сям'і бацька ўступаў у палавую сувязь з кожнай са сваіх дачок па дасягненні імі пэўнага ўзросту. Калі праўда адкрылася і мужчына панёс пакаранне, аднавяскоўцы сталі абвінавачваць дзяўчат у тым, што яны «пасадзілі бацьку за краты».

Дарэчы, Людміла Мун адзначае, што палавыя злачынствы супраць дзяцей (пераважна дзяўчынак) з аднолькавай частатой здзяйсняюць як айчымы, так і родныя бацькі. Большасць з гэтых мужчын не маюць псіхічных ці сексуальных расстройстваў. Але, як справядліва заўважае псіхолаг, адсутнасць сумлення таксама не з'яўляецца захворваннем. Пры тым, што інцэст (палавыя адносіны паміж бацькамі і дзецьмі) забаронены ў большасці культур, такое здараецца паўсюдна, а адрозненне статыстычных даных — пытанне якасці выяўлення злачынстваў супраць палавой свабоды.

— Наш абавязак і адказнасць як бацькоў заключаецца ў тым, каб ствараць з дзецьмі адносіны, у якіх будзе любоў і цяпло. Той, хто недаатрымлівае іх у сям'і, мае большую рызыку быць уцягнутым у гвалтоўныя адносіны, — пераканана Людміла Мун.

Яшчэ адна небяспека сямейнага гвалту ў тым, што ён можа працягвацца з пакалення ў пакаленне. Кожнае дзіця, якое расце ў атмасферы штодзённых здзекаў, мае шматразовы траўматычны вопыт, і невядома, якім чынам ён праявіцца ў будучыні.

### ЯК ВЫЯВІЦЬ ЗЛАЧЫНСТВА І ДАПАМАГЧЫ

З праблемай дзіцячага гвалту любога характару можна звяртацца па тэлефоне агульнанацыянальнай дзіцячай лініі: 8-801-100-1611. Званкі бясплатныя з любога нумара і прымаюцца кругласутачна.

Тэлефонны апарат і камп'ютар, на якія паступаюць звароты, цяпер знаходзяцца ў прыёмным аддзяленні Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя (далей РНПЦ). На камп'ютары ўсталявана спецыяльная праграма, якая дазваляе весці статыстыку званкоў. Першапачаткова на працягу трох гадоў лінія абслугоўвалася двума аператарамі, якія знаходзіліся ў спецыяльным пакоі. Сённяшняе знаходжанне лініі ў РНПЦ — своеасаблівы кампраміс: пакуль што Міністэрства аховы здароўя не можа вылучыць асобную стаўку для спецыяліста, які б займаўся выключна кансультаваннем па тэме дзіцячага гвалту, а ва ўрача ці медсястры, якія дзяжураць у прыёмным пакоі, абавязкі іншыя...

Тым не менш, на лінію штодня паступае па некалькі званкоў. Тэлефануюць суседзі, якія заўважаюць факты гвалту ў адносінах да дзятвы, бацькі кансультуюцца па праблемах у выхаванні. Звяртаюцца і самі дзеці.

**Дзяўчынка пасля таго, як яе згвалтавалі на вуліцы, прыйшла дадому, вымыла вопратку, у якой была, і села рабіць урокі.**

— Тыповы званок: вечарам у пятніцу ці суботу, калі бацька сямейства прыходзіць п'яны і пачынае цікавіцца справамі ў школе, правяраць урокі, так бы мовіць. Далей — прэтэнзіі, якія даходзяць да рукапрыкладства, — распавядае пра самы распаўсюджаныя звароты **намеснік дырэктара па медыцынскай частцы РНПЦ псіхічнага здароўя Сяргей ОСІПЧЫК.**

— Калі дзіця гаворыць, што над ім учынілі гвалт, як правіла, яно гаворыць праўду, — кажа **кіраўнік «Разумення», член камісіі па справах непаўналетніх пры Савеце Міністраў Андрэй МАХАНЬКО.** — Таму яму трэба, у першую чаргу, паверыць. А далей ёсць канкрэтны алгарытм дзеянняў: трэба звярнуцца з заявай у органы ўнутраных спраў ці раённы аддзел Следчага камітэта.

Калі дзіця само не распавядае, што з ім нешта здарылася, трэба звярнуць увагу на яго паводзіны: напрыклад, яно можа раптоўна стаць замкнёным ці, наадварот, гіперактыўным, яго дзеянні могуць стаць сексуалізаванымі (калі гэта не характэрна для ўзросту дзіцяці).

— Мы вельмі хочам, каб у нас была створана асобная сацыяльная служба па справах дзяцей, — працягвае Андрэй Маханько. — Каб там былі сканцэнтраваны ўсе сэрвісы, якія займаліся б і сацыяльным сіроцтвам, і гвалтам, здзейсненым у адносінах да непаўналетніх — усімі відамі парушэння правоў дзіцяці. Гэта павінна быць структура, што будзе мець статус міністэрства і забярэ свае функцыі ў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі, унутраных спраў, працы і сацыяльнай абароны. Вядома, усімі пералічанымі органамі гэтыя функцыі выконваюцца, але ж застаецца пытанне якасці...

Дзіяна СЕРАДЗЮК.

■ Прэм'ера рубрыкі: «Рэліквія маёй сям'і»

***Ёсць рэчы, якія маюць асаблівае значэнне для канкрэтнай сям'і, выконваюць ролю так званага анёла-ахоўніка. Вышыванка, у якой выходзіла замуж бабуля, нацельны крыжык, што разам з малітвай маці ахоўваў дзядулю падчас вайны... Самі па сабе гэтыя прадметы ніякай каштоўнасці не ўяўляюць, але для людзей, якія імі валодаюць, яны неацэнныя. Бо нясуць так званы код роду, дзе сканцэнтравана вялікая сіла любові і самаахвярнасці. А што ўяўляе найбольшую каштоўнасць для вашай сям'і? З кім, як не з «Сямейнай газетай», можна падзяліцца самым патаемным? Як гэта сёння зрабіла Марыя Лугаўцова, што не аднойчы глядзела ў твар смерці. З нецярпеннем чакаем гісторыі пра рэліквіі вашай сям'і. Пішыце, дасылайце фотаздымкі, будзем вельмі ўдзячны за давер.***

# АБЯРЭГ У «КЛЕТКУ», або 7 жыццяў Марыі Лугаўцовай

## Малалетняя вязніца канцлагераў лічыць, што ад смерці ў гады ваеннага ліхалецця яе ратавалі толькі цуд і матуліна хустка

**Сёлета Марыі Астафіеўне спаўняецца 85, хаця, як яна сама падлічыла, сем разоў магла загінуць падчас вайны. У 12 гадоў ёй давялося перажыць жах нямецкіх лагераў, голад, холад. Але невядомая сіла берагла дзяўчынку ў тыя хвіліны, калі, здавалася, ужо не было ніякіх шанцаў на выратаванне. Нібы бясцэнную рэліквію, захоўвае яна матуліну хустку, што саграваla яе ў халоднай зямлянцы і ратавала ў нямецкім палоне. Гэты вялікі ў карычневую клетку абярэг і зараз як новы.**



### АДНА Ў ВАЕННЫМ ЛЕСЕ

Рарытэтная хустка такіх памераў, што нават дарослы чалавек амаль цалкам можа захутацца ў яе, не тое што дзіця. «Яна так і называлася «абкрывацельная», — кажа яе гаспадыня і ўдакладняе: — Да вайны была вельмі модная рэч, каштавала вялікіх грошай. Тата прадаў у Быхаве грушы з нашага саду і купіў маці царскі падарунак. Яна такая шчаслівая была, насіла замест камізэлькі».

Яшчэ адна сямейная рэліквія, якую жанчына захавала з часоў вайны, — ваўняная коўдра. У гарадской кватэры яна без патрэбы, і так цёпла, затое на дачы — незаменная рэч. А ў 1943-м пад ёй даводзілася начаваць нават у зімовым лесе.

Вайна ўрэзалася ў памяць страшным выпрабаваннем. Жылі яны ў вёсцы Новы Быхаў. У сям'і Пелагеі і Астафія Мамаевых (бацькі Марыі Лугаўцовай) гадавалася чацвёра дзяцей. У верасні 1943-га, калі пачаліся вызваленчыя баі за раён, немцы сабралі ўсіх жыхароў вёскі і кудысьці пагналі. Пад покрывам ночы сямейству Мамаевых пашчасціла збегчы ў лес. Вяртацца дадому было небяспечна — і яны выкапалі там зямлянку. Каб не змерзнуць, па начах палілі ўнутры вогнішча.

Іх лясное жытло партызаны перыядычна выкарыстоўвалі як перавалачны пункт. Непадалёк праходзіла чыгунка, якую немцы ахоўвалі вельмі пільна. Перасячы яе можна было толькі ноччу. Вось яны і чакалі ў Мамаевых, пакуль сцямнее. Але аднойчы «базу» рассакрэцілі.

— У той дзень у нас зноў былі партызаны, — узгадвае Марыя Астафіеўна. — Кожны займаўся сваёй справай, а я вырашыла прайсціся па лесе. Адышлася метраў на 100 і бачу: варожыя каскі. З крыкамі пабегла назад. Толькі кулі над галавой засвісталі.

Усе, хто быў у зямлянцы, разбегліся ў розныя бакі. А дзяўчынка, калі пералазіла цераз паваленую елку, зачапілася і паляцела ў снег. Толькі галіны зверху самкнуліся. Так яна і ляжала, пакуль былі чуваць стрэлы. А калі ўстала і агледзелася, побач ужо не было ні душы. Яна не ведала, што рабіць, дзе каго шукаць. Пайшла па слядах і хутка спаткала партызана, які аглядаў мясцовасць пасля перастрэлкі. Ён завёў дзяўчынку ў лагер, але той жа ноччу атрад павінен быў перабрацца ў іншае месца. Марыя спачатку пайшла з партызанамі, але потым вырашыла вярнуцца назад. Што яе прымусіла пайсці на гэта, яна і зараз не можа сабе растлумачыць. Нават у думках страшна застацца адной ноччу ў зімовым лесе, а яна ўсё перажыла наяве. Быў момант, калі дзяўчынка знясіленая, апусцілася на пень і ледзь не заплакала: няўжо гэта ўсё? Калі ўбачыла каля сябе татачку з матуляй, нават вачам не паверыла, падумала, што мроіцца. Але гэта быў не сон. Бацькі ж думалі, што іх дачка загінула падчас стралянiны, вярнуліся, каб яе пахаваць. Калі не знайшлі каля зямлянкі, падаліся ў партызанскі лагер. Слабая надзея, што Марыя ўсё ж такі жывая, прымусіла ісці іх па пакінутых на снезе слядах.

### ПРЫВІД У ЗЯМЛЯНЦЫ

Праз некалькі дзён на вёску, дзе сям'я знайшла часовы прытулак, наляцелі немцы. Бацьку разам з непаўналетнім сынам схапілі, а вось маці з дачушкамі зноў пашчасціла збегчы ў лес. Яны накрыліся белымі абрусамі і непрыкметнымі выслізнулі з вёскі агародамі. Ноччу да іх далучыліся бацька з сынам, але раніцай у лесе іх знайшлі немцы і ўсіх, акрамя Марыі, схапілі. Яны бачылі, што дзяўчынка хворая, і пакінулі яе паміраць. Жанчына дагэтуль не разумее, як яна змагла выжыць зімой у зямлянцы без вады і запалак. Колькі дзён яна так праляжала бездапаможная, нават і не ведае. Ад бяссілля то плакала, то страчвала прытомнасць. Аднойчы ёй падалося, што покрыва на ўваходзе адсунулася і з'явілася маці. Расплюшчыла вочы і зразумела, што трызніць. «Вельмі хацелася піць, але сіл хапіла толькі на тое, каб выпаўзці з зямлянкі і набраць снегу», — усхліпвае жанчына. Слёзы коцяцца з яе вачэй, быццам усё, пра што яна расказвае, здарылася не 70 гадоў таму, а ўчора. І ад таго, што ўспаміны даюцца ёй так складана, разумееш, наколькі страшнай была рэчаіснасць.

Яна амаль ужо ачуняла, калі яе знайшоў у зямлянцы мясцовы жыхар. Ён падказаў сцяжынку да партызан, але яна прывяла да нямецкага патруля. Толькі змарнелае дзіця не выклікала ў іх цікавасці. Як і цяжарная жанчына, якую разам з Марыяй накіраваў да партызан той самы зямляк. Толькі потым дзяўчынка даведалася, што ён быў здраднікам.

У пошуках прытулку Марыя са сваёй спадарожніцай пастукалі ў дзверы адной з вясковых хат. Людзей там знаходзілася столькі, што нават прысесці не было куды. Тут сабраліся ўсе, каго з родных дамоў выгналі немцы або чые хаты згарэлі. Дзяўчынка знайшла вольнае месца каля сцяны і стаяла так некалькі гадзін, пакуль яе не знайшла нейкая далёкая сваячка з суседняй вёскі. Чуткі, што з'явіліся новыя пастаяльцы, дайшлі і туды. Хата сваячкі была нічым не лепшай за тую, адкуль яна прывяла Марыю. Ні акон, ні дзвярэй... Нават столі не было. А праз некалькі дзён немцы ўсіх сагналі ў стайню. Там наогул былі толькі сцены. Людзі спалі на зямлі ля вогнішча.

### ДРУГОЙ МАЦІ ЁЙ СТАЛА ДУСЯ

З таго самага моманту, як яе пакінулі паміраць у лясной зямлянцы, і да канца вайны Марыя нічога не ведала пра сваю сям'ю. Аднойчы раніцай немцы пагналі жыхароў вёскі з абозам у Быхаў, а адтуль у цяплушках павезлі ў Магілёў. Сярод палонных дзяўчынка сустрэла і сваіх стрыечных сясцёр. Разам з імі яна трапіла ў турму, што знаходзілася ў абласным цэнтры непадалёк ад машынабудаўнічага інстытута. У памяці засталіся вузкія цёмныя калідоры, па якіх кожны дзень іх вадзілі на допыты, нары, з кароценькімі паведамленнямі вывезеных у Германію людзей, рэдкі суп з маленькім кавалачкам хлеба з аўсянай шалупіны — бедны паёк, на які яны маглі разлічваць усяго адзін раз у дзень. Але ў параўнанні з тым, што Марыі ўжо прыйшлося перажыць, тут яшчэ было не так дрэнна. Толькі і гэта хутка скончылася.

На чужыну іх везлі ў «цялячым» вагоне. 7 дзён без вады і ежы, без свежага паветра і элементарных санітарных умоў. Не ва ўсіх атрымалася вынесці такое выпрабаванне. Толькі ў Варшаве людзям далі трохі супу і павезлі далей. Канчатковым прыпынкам быў канцлагер у Альдэнбургу. Цягнік заехаў прама на яго тэрыторыю. Гэты момант і зараз у яе перад вачамі. Па перыметры — калючы дрот, назіральныя вышкі і каравульныя з аўтаматамі. А з дынамікаў на ўсё наваколле раве бравурная музыка. У бараку, куды трапіла Марыя, стаяла жалезная печка. Нехта з запаслівых знайшоў у кішэні жменьку проса і зварыў яго ў бляшанцы. Дзяўчынцы таксама далі лыжачку. Якой жа смачнай падалася ёй тая каша. У канцлагеры пра такую ежу можна было толькі марыць. Людзей кармілі пустой вадой з бручкай, а замест гарбаты давалі шклянку кіпеню.



Марыя з бацькам Яўстафіем Васільевічам Мамаевым і братам Мікалаем, жнівень 1948 года.

Так склалася, што ў Альдэнбургу Марыі давялося расстацца са стрыечнымі сёстрамі. Ад таго, што яна зноў засталася адна, дзяўчынка заплакала. Але жанчына з яе вёскі супакоіла: «Не плач, калі хочаш, я буду табе замест маці». З тых часоў яны заўсёды былі побач. Удзячнасць да Еўдакіі Панурынай, ці, як яна называла яе, «маці Дусі», Марыя Лугаўцова захавала на ўсё жыццё.

У Фэхце, куды іх прывезлі працаваць на заможнага баўара, дзяўчынку адправілі на кухню. Палонных кармілі той жа бручкай, што і ў Альдэнбургу, але кідалі ў суп некалькі бульбін. Калі Марыя іх чысціла, баялася згубіць нават грам каштоўнага прадукту. Аднойчы яна дапамагла палоннай палячцы ўскапаць агарод. Тая была настолькі ўдзячна дзяўчынцы, што потым увесь час падкармлівала і нават дзялілася адзеннем.



Марыя Лугаўцова з мужам Уладзімірам і дзецьмі Пятром і Валянцінай, 1963 год.

Набліжаўся май, усё часцей бамбілі нямецкія вёскі і гарады. Палонныя таксама рызыкавалі. Аднойчы каля Марыі разарваўся снарад, яна толькі цудам не загінула. З няволі іх вызвалялі амерыканцы. Праз некалькі месяцаў Марыя са стрыечнымі сёстрамі ехала ўжо на вялікай машыне з адкрытым верхам да савецкай мяжы. І як самыя каштоўныя трафеі прыціскала да грудзей тую матуліну хустку і коўдру. У далёкай дарозе яны зноў ратавалі яе, але на гэты раз ад праліўнога дажджу.

### ЗА НЕЧАЛАВЕЧЫЯ ВЫПРАБАВАННІ — ШЧАСЛІВАЯ ДОЛЯ

На жаль, не дажыў да Перамогі старэйшы брат Марыі, які ваяваў у партызанах. Бацька вярнуўся з фронту, але хутка пайшоў з жыцця. Маці засталася адна з траімі дзецьмі. І каб не памерці з голаду, ім усім трэба было шмат працаваць. У той галодны час вельмі выручаў лес, адкуль кошыкамі насілі грыбы і ягады. Хадзілі чуткі пра галодных ваўкоў, якія нападаюць на людзей. Марыя таксама пра гэта ведала, але калі сустрэла на лясной сцяжынцы «нейкага шэрага сабаку», нават не спалохалася. Працягвала збіраць ягады і спакойна перагукацца з роднымі. І толькі калі збянтэжаны звер, падціснуўшы хвост, пабег углыб лесу, зразумела, як яна рызыкавала.

А колькі разоў пра сябе яшчэ нагадвала вайна. Неяк дзеці пабеглі па арэхі і Марыя выпадкова зачапіла нейкі дрот. Выбухнула... Тое, што ніхто не загінуў, таксама можна лічыць цудам. Абышлося без ахвяр і ў той раз, калі дзеці праз глупства нацягалі ў адну кучу боепрыпасы і падпалілі. У гэты момант нехта заўважыў, што каровы, якіх яны пасвілі, далёка сышлі. Малыя кінуліся наўздагон, і тут страшны выбух ускалыхнуў наваколле. На тым месцы, дзе хвіліну таму было вогнішча, засталася вялізная яма.

Марыя Астафіеўна ўпэўнена, што анёл-ахоўнік заўсёды быў з ёй побач і вёў па жыцці. Яна скончыла медыцынскую ўстанову, паспяхова выйшла замуж. Муж, як кажуць, насіў яе на руках. Дом заўсёды быў поўнай чашай. «Я жыла, як каралева, — усміхаецца жанчына. — За ўсе мае пакуты Бог падараваў мне доўгае шчаслівае жыццё».

Перад тым, як развітацца, жанчына дастае невялікі мяшочак і высыпае на стол каля дзясятка медалёў. Сярод іх — узнагарода за добрую працу, астатнія — юбілейныя. Але для Марыі Лугаўцовай яны шмат чаго значаць. «Дзякуй усім за тое, што на мяне не забываюцца», — кажа яна і зноў плача. Дарэчы, гісторыя яе жыцця захоўваецца ў школьным музеі баявой славы магілёўскай школы №34. Рэферат, які напісала вучаніца Вольга Глазкова, быў прадстаўлены на рэспубліканскім конкурсе, прысвечаным айчыннай гісторыі. Жыццё гэтай жанчыны — яркі прыклад таго, як дорага каштуе мірнае неба і як важна яго берагчы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара і з архіва Марыі Лугаўцовай**

■

# ЖЫЛІБЕР У ГАРОДНІ. ПАДАРОЖЖА-РЭКАНСТРУКЦЫЯ

**У адзін з кастрычніцкіх дзён 1775 года межы Гародні, якая ўяўляла з сябе мешанку драўляных пабудоў, мураванак і палацаў на розных стадыях узвядзення і разбурэння, перасек экіпаж, нагружаны цяжкімі куфрамі. У куфрах тых — кнігі ды медыцынскае абсталяванне, насенне ды саджанцы розных раслін, гербарый, прылады для астранамічных (гэта значыць, за прыроднымі з'явамі) назіранняў. Гаспадар экіпажа, стомлены (ці натхнёны?) амаль трохмесячным пераездам ажно з Ліёна, зірнуўшы за фіранку, усклікнуў: «J'avais bien besoin de!» Ну, або нешта падобнае. І незразумела, ці азначала гэта: «Чорт мяне паблытаў!» Ці ўсё ж трошкі іншае кшталту: «Даволі мілы гарадок, трэба сказаць».**

Такім уяўляўся прыезд Жылібера ў Гародню нам, валацугам з XXI стагоддзя, якія (праўда, на аўтамабілі) добраахвотна перамясціліся ў часы толькі што забароненага езуіцтва, набрынялага прагай таямніц масонства і медыцынскіх рэформ, вартых гонару і пераймання. Парк імя Жылібера для нас пакуль што не парк, а фігура, што сустракае пры ўваходзе. Ніякі не гараджанін XVIII стагоддзя, як афіцыйна пазначана, а менавіта той, хто нам патрэбен, — месье Жан Эмануэль Жылібер, 34-гадовы доктар з Францыі, які заклаў вось тут, на месцы, дзе пасля будуць круціцца каруселі, найлепшы ў Еўропе батанічны сад з экзотамі кшталту д'ябальскага муштука, або кораня аднарога.

Трошкі ўбаку стаіць будынак у стылі барока, прыдуманы італьянцам Джузэпэ дэ Сака, прыдворным архітэктарам Тызенгаўза. Гэты руховы трохпавярховік з «крыламі», «адсечанымі» шасціграннымі вежамі, і ёсць заснаваная месье Жылібером медыцынская школа. У вежах

## Паслядоўнікам

**Гуляючы па гродзенскім парку, можна ўбачыць яшчэ аднаго «гараджаніна XVIII стагоддзя». Ён сядзіць на лавачцы ў такім самым камзоле, аздобленым каўнерам жабо, і туфлях са спражкамі. Але той гараджанін — не Жылібер. Гэта помнік архітэктару Джузэпэ дэ Сака, што спланаваў будынак медыцынскай акадэміі.**

размяшчаюцца аўдыторыі, у якіх дзеці сялян з ваколіц Гародні вывучаюць лаціну, анатомію і хірургію. Чуеце, як адз'юнкт Вірыён цытуе некага з класікаў? «Чаго не вылечвае жалеза, тое вылечвае агонь, чаго не вылечвае агонь, тое трэба лічыць невылечным». Праз два з нечым стагоддзі гэты будынак будзе аддадзены ваеннай камендатуры. Таму фатаграфавацца на яго фоне забаронена. Пойдзем хіба далей.

Вось езуіцкая аптэка, з якой у XXI стагоддзі зробяць аптэку-музей. Уваходзім сваім яна павернута ў двор, бо яшчэ нядаўна належала ордэнскаму кляштару. Цяпер, калі дзейнасць езуітаў прыпынена, тут распараджаецца Жылібер — вучыць сваіх выхаванцаў атрымліваць з карэньчыкаў і лісця розных plantago ды taraxacum вохкія парашкі колеру мёртвай вады...

З французскім энтузіязмам узяўся Жылібер у Гародні за справу — і з гэткай жа французскай бескампраміснасцю пачаў ладзіць scandale. Выдзелены яму спадаром Тызенгаўзам



Слаўны доктар Жылібер.

асабняк — з прыслугай і тройкаю коней, прадуктамі, дровамі, свечкамі (прынамсі, выдаткі за тры гады склалі 17 785 злотых) — аказаўся, мякка кажучы, «не вельмі». Мы не ведаем, дзе той асабняк стаяў дакладна, але чамусьці верым, што ён быў «не вельмі». Між тым, на мяса месье Жан таксама скардзіўся: маўляў, нясвежае. Ды хто тое мяса цяпер праверыць? Па звестках на 1779 год, калі Жылібер «разгарнуўся», у заходняй частцы рынку, паблізу колішняй Мастовай, стаялі так званыя «яткі хрысціянскія мясныя». Трымалі іх нейкія браты Януцэвічы, Андрэй і Міхал, а таксама Пётр Барташэвіч. Дык яткі тыя, як даследчыкі пішуць, мала што былі мураваныя, дык яшчэ мелі агароджу і вароты. Гэта значыць, цывілізаваны гандаль у цывілізаваным горадзе цывілізаванай краіны. «А што ўяўляў з сябе гандаль мясам у Францыі?» — спытаеце вы. А я


Гародня часу Жылібера.
Злева ад касцёла — аптэка і адначасова «вучэбная база».

адкажу, і вельмі дакладна. Словамі Дзяніса Фанвізіна, бо якраз тады ён выпраўіўся ў родны для Жылібера французскі Ліён, каб выгнаць з жонкі «чарвяка». Французскія эскулапы напаілі жанчыну арэхавым маслам — і дапамагло! Дык вось што Дзяніс Іванавіч, уражаны Ліёнам і ім жа абураны, пісаў тады сваёй сястры: *«Скажу тебе один пример, а по сему и прочее разумевай: шедши по самой лучшей улице в Лионе, увидел я вдруг посреди ее много людей и несколько блистающих факелов среди белого дня. Я думал, что это какое-нибудь знатное погребение, и подошел посмотреть поближе. Вообрази же, что я увидел? Господа французы изволят обжигать свинью!*


Жылібер ці гараджанін XVIII стагоддзя?

*Подумай, какое нашли место, и попустила ли б наша полиция среди Миллионной улицы опаливать свинью! Словом сказать, господа вояжеры лгут бессовестно, описывая Францию земным раем».*

Наш Жылібер, відаць, таксама прыхарошваўся, выдаючы сябе за цывілізаванага месье ў краіне зуброў і мядзведзяў. Але мы сімпатызуем яму як нашаму герою. Мы даруем Жылліберу легкадумны апломб за ўсе яго тутэйшыя дасягненні. Ды і зуброў нашых ён вывучаў, надзвычайнейшым чынам, у анатамічным тэатры. Такія таямніча-жахлівыя ўстановы з надпісам на франтоне пра смерць, якая ў гэтым месцы прызвана дапамагаць жыццю, мела кожная паважаная медыцынская акадэмія. І мясцовая не адставала. Тут прэпаравалі не толькі памерлых людзей, але — нашмат часцей — і жывёл. І доктар Жылібер лічыў, што скура з ілба зубра, маючы характэрны мускусны пах, можа выкарыстоўвацца для «паскарэння родаў у нервовых жанчын».

Вы ж хаця не верце тым, хто прыпісвае памяць пра Жылібера будынку ў Тэлеграфным завулку, так званаму Дому масонаў. Так, Жылібер быў масонам. Але дом гэты пабудаваны не менш як праз дзесяць гадоў пасля таго кастрычніцкага дня, калі межы Гародні перасек экіпаж, нагружаны цяжкімі куфрамі. І дакладна пазней, чым Жан Эмануэль Жылібер у суправаджэнні 76 павозак з бібліятэкай, гербарыем і калекцыяй мінералаў выехаў з Гародні назаўсёды.

Падарожнічала
Святлана ДЗЯНІСАВА.

## Рамантыкам

**Большасць падарожжаў на аўтамабілі адбываецца пры непасрэдным удзеле Сонца і яго актыўнай падтрымцы: ранкам едзеш насустрач усходу, вечарам вяртаешся, сузіраючы захад. Сонца — сведка ўсіх нашых вандровак. І, напэўна, яны яму даспадобы, інакш не перадавала б яно нам такі крэатыўны настрой. Неяк, назіраючы разлітую па лініі гарызонту чырвань, пяцігадовы на той час Сяргейка зрабіў выснову, вартую асаблівай сімпатыі. «Гэта Сонейка папраўляе коўдрачку», — сказаў ён.**


Медыцынская акадэмія Жылібера на малюнку Напалеона Орды.

## Што бывае

### АДКРЫЦЦІ

**Закон пераходу колькасных змен у якасныя ў дачыненні да вандроўных асоб сцвярджае наступнае: інфармацыйна-эстэтычнае ўздзеянне наведаных мясцін і ўбачаных экспанатаў пасля пэўнай колькасці перадапошніх і апошніх праходзіць «кропку біфуркацыі» (раздвaення) — частка яго адбіваецца на стане душы вандроўніка адразу, непасрэдна ў момант сузірання, другая ж, значна большая, стварае элемент адтэрміноўкі, з-за чаго закон атрымлівае назву Закона інфармацыйна-эстэтычнага паслядзеяння.**

**Такая вось разумная думка аформілася ў маёй галаве праз пэўны час пасля наведвання чарговага музея і сузірання новай безлічы рарытэтаў. Кажучы прасцей, калі вы не вельмі ўражаны падарожжам, то гэта, магчыма, часова. Прыйдзе час, калі вам захочацца яго паўтарыць.**

## ДАЛЁКА І БЛІЗКА

**На беразе возера Шчэпчына балота пад Зеленаградам 15—17 мая пройдзе дабрачынны і добраахвотны фэст творчасці і кахання пад назвай «Шчэпка/Адлюстраванне». Усё разам і адначасова, навыперадкі і па чарзе: лекцыі і спартыўныя спаборніцтвы, музыка і архітэктура, майстар-класы і кірмашы, электроніка і касмічныя назіранні.**



25 мая ў Балгарыі — штогадовае свята ружы. У цотныя гады яго прымае Казанлык, у няцотныя (і сёлета) — Карлава. Рытуальны збор кветак пачынаецца на плантацыі, у адкрытым полі, а потым дзея пераносіцца ў горад, дзе ўжо чакаюць фальклорныя ансамблі, мастакоўскія пленэры, дэманстрацыі рамёстваў, частаванні свежаспечанымі аладкамі і іншыя культурныя мерапрыемствы і відовішчы.

**22 мая ў Лейпцыгу — Wave-Gotik-Treffen, найбуйнейшы ў свеце фэст гатычнай культуры. Чатыры дні «людзі ў чорным» слухаюць і граюць змрочную музыку, ладзяць сярэднявечныя кірмашы і экскурсіі па могілках, гуляюць у ролевыя гульні і чытаюць лекцыі, прычым гэтыя людзі не абавязкова моладзь. Наведнікаў чакаюць яшчэ і тэатральныя пастаноўкі, і разнастайныя выставы, і кінапрэм'еры.**



Музеі не спяць — гэта ведаюць ужо ўсе. Тым больш у маі. У адмысловую музейную ноч адны з іх прапануюць рамантычныя спатканні на сваіх дахах, другія — папіць гарбаты ў БССР, трэція — прыняць удзел у шоу мыльных пузыроў... Дзе вам цікава, туды і накіроўвайцеся, тым больш што падрабязнасці мерапрыемстваў усе музеі напярэдадні сваёй галоўнай ночы абвяшчаюць наперабой.

**У Мінску пачалі біць фантаны! Самы вялікі — плывучы фантан на Камсамольскім возеры. Самы прыгожы — ля Палаца Рэспублікі. Самы рамантычны — ля Чырвонага касцёла. Самы захапляльны — ля тэатра оперы і балета. Самы натуралістычны — ля Камароўскага рынка. Самы прэтэнцыёзны — на плошчы Незалежнасці. Самы асвяжальны — ля Нацыянальнай бібліятэкі. Ці ў вас свой рэйтынг? Гайда правяраць!**

15—17 мая ў Мінску — фестываль рэтрааўтамабіляў. Калона старых самаходаў праедзе па горадзе з непрацяглымі экспазіцыямі каля «МінскЭкспа», Палаца Рэспублікі і Палаца спорту, а потым рушыць да Музея авіяцыйнай тэхнікі, дзе самаходы застануцца радаваць душу і цешыць вока аж да самага канца фестывалю. Гэта будзе шыкоўна!



**Кожны чацвер а шостай вечара ў Мінску на вуліцы Маскоўскай, 18 можна трапіць у «Пераплёт». Так названы кніжны клуб у бібліятэцы №1, які прапануе абмеркаваць прачытаныя кнігі, прыняць удзел у разборы п'ес, паглядзець кіно і папіць гарбаты. Толькі не забудзьцеся запісацца (каб вас там чакалі) і прынесці тое-сёе з ласункаў да гарбаты (каб вас там чакалі асабліва).**

## Святлана БАРОЎСКАЯ:

# «САПРАЎДЫ, АДЧУВАЮ: Я — ЗА МУЖАМ...»



**Калі б хтосьці вырашыў скласці рэйтынг самых прыгожых жанчын Беларусі, несумненна, адной з першых там была б тэлевядучая Святлана БАРОЎСКАЯ. Прыгожая, разумная, энергічная, яна валодае велізарнай сілай магнетызму і абаяльнасці. У яе заўсёды выгляд паспяховага чалавека. Яна ўвесь час усміхаецца. У адных гэта выклікае захапленне, у іншых — зайздрасць. Многія ўпэўнены, што сваім поспехам Святлана абавязана мужу, знакамітаму кінаакцёру Анатолію КАЦЯНЁВУ. Журналісты неаднойчы называлі іх самымі прыгожымі мужам і жонкай у Беларусі.**

**Муж у Святланы, і сапраўды, мара жанчын. І ў прамым, і ў пераносным сэнсе. У сярэдзіне 1980-х гадоў на тэлеэкраны выйшаў ваенна-прыгодніцкі серыял «Сакрэтны фарватар» — і выканаўца галоўнай ролі, Анатоль Кацянёў, адразу ж стаў сапраўднай зоркай. Па ім уздыхалі тысячы дзяўчат ва ўсіх канцах былога Савецкага Саюза. А ён неўзабаве ажаніўся з маладзенькай студэнткай Мінскага тэатральнага інстытута, і вось ужо больш за чвэрць стагоддзя яны разам.**

**Папулярная вядучая тэлеканала «Беларусь — 1» расказвае пра сябе, свайго мужа і сям'ю:**

*— Я выйшла замуж вельмі рана — на другім курсе інстытута. Да таго часу ў мяне было ўжо дастаткова прапаноў рукі і сэрца. І я зразумела, чаму выбрала менавіта Толю: таму што якраз ён мяне замуж і не клікаў... Мусіць, вельмі добра ведаў пушкінскага «Яўгена Анегіна»: «Чем меньше женщину мы любим, тем легче нравимся мы ей...»*

*Калі я паступіла ў тэатральны інстытут, мы па студэнцкіх білетах хадзілі на многія спектаклі. І ў тэатр кінаакцёра таксама. Дарэчы, ён лічыўся ў нас, у інстытуце, тэатрам жаніхоў. У некаторых нашых дзяўчат былі раманы з яго акцёрамі. І ў мяне тады быў кавалер, які і прывёў туды...*

*Дык вось Толя потым расказваў, што калі я прыходзіла ў іх тэатр, ён гаварыў: «Якая ў гэтага акцёра прыгожая дзяўчына!» А ў мяне тады былі вельмі доўгія валасы. Ён успамінаў: «Ты хадзіла з та-а-акімі валасамі!.. Такая была прыгожая, дзёрзкая правінцыялка!» — «Ну, так, — кажу, — я была дзёрзкай правінцыялкай. Што тут такога?.. Чытайце класіку: «Найлепшыя жанчыны нараджаюцца ў правінцыі».*

*А потым мы з ім сустрэліся: тэатральны інстытут і мой інтэрнат у адным будынку знаходзяцца. І вось у мяне паміж заняткамі ўтварылася «фортка», я пасля ўрокаў танца ў купальніку-трыко і плашчы бягу па вуліцы і сустракаю Толю. «Прывітанне!» — «Прывітанне!» Раптам ён гаворыць: «Вой, як ты лёгка апранута!» — і шалік мне на шыю накручвае. Гэта быў такі інтымны момант!.. Ён яшчэ свае ямачкі на шчоках «уключыў»... Я заўсёды бачу, ШТО чалавек адчувае ў пэўны момант. Магу нават не аналізаваць, важная вось гэтая «фарсінка», калі ты адчуваеш хвалі, якія ад чалавека ідуць.*

*І Толя стаў запрашаць мяне да сябе ў госці. Ды каб я да хлопца (да таго ж вельмі дарослага) — у госці пайшла?!.. Ніколі! Хаця было вельмі прыемна, што мяне запрашае сам «Сакрэтны фарватар»!..*

Тэлесерыял «Сакрэтны фарватар» і сёння любяць гледачы, а ў той час ён быў проста фантастычна папулярны. Галоўны герой увасабляў вобраз сапраўднага мужчыны — прыгожы, мужны, высакародны. Немагчыма было ў яго не закахацца. А калі ты бачыш яго ў рэальным жыцці, побач, блізка...

*— Я ж спачатку пакахала не Толю Кацянёва, а «Сакрэтны фарватар». Потым яму пра гэта неаднойчы гаварыла, а ён не хоча верыць. Кожная дзяўчына марыць пра сур'ёзнага, паспяховага мужа... Гэта сёння ў модзе «банкіры», а ў той час дзяўчаты вельмі захапляліся артыстамі. Вось я і выйшла за самага паспяховага з іх. Мне — або найлепшы, або ні якага не трэба... Усё павінна максімальна супасці па маёй шкале... Думаю, я наўрад ці закахалася б у артыста, які са словамі «На стол пададзена!» выходзіць у спектаклі адзін раз. Не люблю няўдачнікаў і сквапных мужчын...*

*Потым мы з Толем сустрэліся ў кінастудыі. Ён зноў стаў запрашаць да сябе. А я — не і не!.. Мяне мама навучыла ў гэтым плане: колькі разоў хлопцу сказаць «не», куды паглядзець у такі момант ды як узмахнуць вейкамі...*

Святлана ўсміхаецца. Зразумела, яна гэта кажа з гумарам, як і многае іншае ў нашай размове.

*— І калі ён трэці раз запрасіў мяне ў госці, я падумала, што цяпер можна пайсці папіць гарбаты (смяецца). Я пайшла. І ўсё... Гэта быў крах маіх надзей на тое, што я ніколі ні ў каго не закахаюся...*

На пачатку вучобы студэнткі акцёрскага факультэта шчыра кляцуцца сабе, сяброўкам, выкладчыкам, што ў найбліжэйшыя гады ні ў каго не закахаюцца, не выйдуць замуж, не пачнуць рана нараджаць дзяцей, а будуць усе свае сілы аддаваць дасягненню вялікай мэты — стаць знакамітымі артысткамі. Але... Юных прыгажунь з тэатральнага інстытута «разбіраюць» замуж вельмі хутка...

*— Ён частаваў мяне халадніком... Быў такі клапатлівы, такі гаспадарлівы!..Усё ўмеў рабіць!.. У яго быў такі чысты пакой!.. І ўсе рэчы — па паліцах!.. Адным словам, тое, што я ўбачыла, мне вельмі спадабалася. Усё было, як мы ў кніжках чыталі: разумны, прыгожы, сур'ёзны, надзейны... Мара любой дзяўчыны. Я была ўражана і трымалася нядоўга...*

*Адным словам, я патэлефанавала дадому: «Мама, я выходжу замуж!» А мама, як сірэна: «А-а-а-а!..» Я адразу паклала трубку. І вось, пакуль я прыйшла з інстытута ў інтэрнат, яна ўжо прымчалася з Маладзечна і сядзела ў маім пакоі. Гэта было проста нейкае паханванне: «Як рана!.. Ён жа дарослы мужчына!.. Яму ўжо трыццаць гадоў!.. А табе яшчэ трэба вучыцца!..» Але я была няўмольная.*

Святлана Бароўская ў інтэрв'ю вельмі часта і цёпла ўзгадвае сваю маці. Падкрэслівае: нягледзячы на тое, што яна вельмі строгая і нават магла б узначаліць усіх строгіх мам у свеце, насамрэч яны — вялікія сяброўкі. Дзіўна, што тады, на другім курсе, Святлана не паслухалася маці...

*Памятаю, як я везла Толю знаёміцца са сваімі бацькамі (смяецца). Адрэпеціравала ўсё, як галоўны рэжысёр: і што тату сказаць, што маме... Ён ідзе з кветкамі, як сапраўдны жаніх, а мама — у акне. Усміхаецца... Мы прыйшлі — стол накрыты, тазік «аліўе» стаіць, за сталом ужо мая малодшая сястра сядзіць. Бацькі ўбачылі Толю, трохі супакоіліся. А ён, дарэчы, не надта абцяжарваў сябе думкай спадабацца ім... Проста арганічна паводзіў сябе... Жартаваў... Мама сказала яму: «Ну, Толечка, з'еш яшчэ хаця б адзін драніпак». А ён адказаў: «А што гэта вы мяне абмяжоўваеце, Кацярына Дзмітрыеўна?» І потым запытаўся: «Ну, я цяпер буду вас мамай клікаць?» А маці засмяялася: «Сынок мне знайшоўся! Усяго на восем гадоў маладзейшы!..»*



Сям'я Кацянёвых.

*Ведаеце, каб цяпер мяне спыталі: памыліліся вы ці не ў сваім выбары, я адказала б — не памылілася!.. Ён добры, надзейны, клапатлівы... Усё, што трэба брыльянтаваць, адраманатуе, усё, што трэба прыбіць маламком, прыб'е. Пытанні фінансавага забеспячэння сям'і фактычна цалкам на ім. Ён вельмі адказна ставіцца да абавязкаў галавы сямейства. Сапраўды, адчуваю: я — за мужам.*

*А які ён цудоўны бацька! Як Толя калыхаў дзяцей па начах, асабліва другога, Кліма, ён у нас кепска спаў. Ужо за адно гэта майму мужу трэба паставіць помнік. Таму што не ўсе таты падымаюцца, калі дзіця пачынае плакаць, звычайна штурхаюць у бок жонку... Толя мог насіць дзіця гадзінамі. Ходзіць, ходзіць, маўчыць... Калі я ўся такая імпульсіўная, то ён — сапраўдны спакой, грунтоўнасць, станаўнасць, ахайнасць, скрупулёзнасць. На жаль, рознасць характараў — гэта асноўны канфлікт нашага жыцця. Муж вельмі закрыты. Можа тыдзень маўчаць. А я не магу так, мне трэба, каб было нейкае дзеянне...*

Спачатку ім было складана адно з адным. Як і любой маладой сям'і, дзе ідзе працэс прыціркі характараў. Але яны ўмудрыліся ў пачатковы перыяд сумеснага жыцця нават зняцца ў адным фільме — блокбастары «Дэзерцір». Праўда, Святлана не надта любіць гэты фільм.

*— Уражанні ад здымак засталіся... жахлівыя. Няма нічога горшага, чым здымацца разам з мужам. Толя ўвесь час гаварыў, што і як мне рабіць, як іграць, як паводзіць сябе... У нас там была сумесная сцэна, вельмі сексуальная. Уяўляеце, як іграць з мужам каханне, калі наўкол стаяць пяцьдзясят чалавек і ўсё наўкол гарыць!.. Таму я абсалютна абыякавая да «Дэзерціра». Толя там — так!.. Змагаецца, «валіць» бандытаў, усіх перамагае... А я... Больш люблю іншы свой фільм — «Пяшчотная зіма». Там — маё жыццё...*

Сцэнарый фільма «Пяшчотная зіма» напісала Юлія Ляшко, з якой Святлану звязвае шматгадовае, моцнае сяброўства. Ролю вераломнай сяброўкі ў гэтым фільме сцэнарыстка пісала спецыяльна для Бароўскай. Рэжысёр запрасіў здымацца менавіта яе. І — дакладнае пападанне! Роля атрымалася! Бароўская на экране — чароўная, спакуслівая, каварная...

*— У «Пяшчотнай зіме», сапраўды, маё жыццё. Мы здымаліся ў інстытуце, дзе я вучылася, у інтэрнаце, дзе я жыла, на кухні — на маёй інтэрнатаўскай кухні!..*

Многіх прыхільнікаў пары цікавіць, як у маленькай суполцы пад назвай «сям'я» ўжываюцца два такія неардынарныя характары, дзве выдатныя асобы, дзве яскравыя зоркі.

*— Мы маглі б за гэтыя гады развесціся дзвесце разоў, калі б кожны з нас ішоў далей у чарговым канфлікце, каб не саступалі ўзаемна адно аднаму. Першыя гады сямейнага жыцця ён мяне проста даймаў сваёй педантычнасцю: каструля павінна стаяць так, а накрыўка павінна ляжаць так... Вядома, я трохі разгільдзяйка. Калі кінула сукенку ў крэсла, то яна мне там не замінае. Няхай сабе ляжыць, пакуль я не захачу яе прыбраць. У Толі ж ад гэтага «калатун» пачынаўся.*

*Прайшлі гады, і я сама стала прыбіраць рэчы ў шафу... А Толя стаў, скажам так, больш... разгільдзяісты. Мы трохі памяняліся рысамі характару. І перасталі перавыхоўваць адно аднаго. Я нават аднойчы падслухала, што ён пра мяне сказаў: «Ну, у яе такі характар...» Няўжо праз столькі гадоў ён зразумеў, што ў мяне такі характар?! І я сама ад яго пакутую.*

*Ведаеце, гаворацъ, што ёсць лінія фронту ў сямейным жыцці. Вось мая тэрыторыя: сяброўкі, кніжкі, уборы... У мужа: рыбалка, лазня... І кожны з нас спрабуе перайсці тую лінію, залезці на чужую тэрыторыю. А гэтага, пераканана, рабіць нельга...*

Людская пагалоска ўжо шмат разоў разводзіла Святлану Бароўскую з Анатолем Кацянёвым, прыпісвала ім сямейныя праблемы... На жаль, чуткі — гэта звычайная з'ява для людзей публічных. Да таго ж, калі муж і жонка паспяхова займаюцца кожны сваёй прафесіяй.

Анатоль пастаянна ў ад'ездзе, яго запрашаюць здымацца ў беларускіх, расійскіх, украінскіх фільмах і тэлесерыялах. Калі ён вяртаецца дадому з кіназдымак, для сямейнікаў — свята. Праходзіць дзень, другі, і яны са Святланай стараюцца з'ехаць з горада. У іх ёсць дом на беразе Вілейскага вадасховішча. Для іх абаіх — лепшага дома на свеце няма. Асабліва для Кацянёва, заўзятага рыбака. Ён яго так і называе — «дом рыбака».

Сынам тут таксама падабаецца. Старэйшы, Уладзімір, скончыў філасофскі факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, працуе ў адной піяр-кампаніі. Сур'ёзны, разважлівы, эрудзіраваны. Малодшы сын, Клім, — натура творчая, вучыцца ў дзясятым класе і яшчэ толькі выбірае свой шлях у жыцці. Святлана з Анатолем ганарацца сынамі. І адно адным...

*— Думкай Толі я даражу... Неяк ён інтэрв'ю даваў адной газеце... Я прачытала... О!.. Дык вось я якая для яго — каханая і адзіная!..*

*А калі прачытала словы: «На мяне ніхто не можа крычаць. Адзіны чалавек у свеце, каму я гэта дарую, — мая жонка!..» Прызнацца ў такім публічна! Для мяне гэта шмат значыць. За такое я ўсё магу яму дараваць (усміхаецца).*

Амаль чвэрць стагоддзя Святлана Бароўская працуе на беларускім тэлебачанні. Шмат гадоў запар яна будзіць краіну разам з праграмай «Добрай раніцы, Беларусь!» А зусім нядаўна на тэлеканале «Беларусь 1» з'явілася аўтарская праграма Святланы Бароўскай «Выхад ёсць». З вялікім майстэрствам, пры дапамозе нестандартных пытанняў і ўмення выклікаць прыхільнасць і давер тэлевядучая «раскручвае» вядомых людзей на шчырасць і нечаканыя для іх самых прызнанні. Яе госці — а сярод іх ужо былі Мікалай Мірны, Вольга Клебановіч, Эльвіра Сакура, Таццяна Бандарчук, Ала Цупер, Лідзія Ярмошына, Аляксандар Ціхановіч, Іскуі Абалян — жартуюць і плачуць у эфіры, прызнаюцца ў слабасцях, расказваюць пра свае цяжкасці, праблемы, крыўды, пра тое, як яны перажылі ў жыцці здраду ці нейкую бяду... І заўсёды іх расповед мае сцвярджальны фінал: «Выхад ёсць!»

«Я не з усімі магу так шчыра размаўляць, з табой магу», — сказаў Святлане Бароўскай падчас перадачы народны артыст Беларусі Аляксандр Ціхановіч. На маю думку, гэтыя словы — найвялікшы камплімент для тэлевядучай, высокая ацэнка яе прафесійнага таленту.

Святлана ж прызнаецца, што ўсяго толькі хацела зрабіць перадачу аб простых і спрадвечных ісцінах — жыцці, каханні, сям'і, радасці... Пра тое, чым яна сама так даражыць у жыцці і што так клапатліва захоўвае ўжо шмат гадоў...

**Тамара БУНТА.**



З мамай Кацярынай Дзмітрыеўнай.

# ТРЫ ПЕРАМОГІ АДНОЙ СЯМ'І

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Больш адмаўляцца ад дзіцяці Алене не прапаноўвалі і, гледзячы на яе рашучасць, далі жанчыне і яе малому тры дні. Доктар паабяцаў маці, што калі за гэты час дзіця здолее высмактаць без кропельніцы і пачне набіраць вагу, то адпусціць іх разам дадому. Алена рабіла ўсё, каб накарміць малое. І ў яе атрымалася. І хоць дзіця па-ранейшаму зрыгвала добрую частку груднога малака, яно раптам пачало набіраць вагу.

— Мы з мужам разумелі, што нам будзе нялёгка, — тлумачыць Алена. — Але вырашылі, што зробім усё магчымае і немагчымае для таго, каб дапамагчы нашаму Юрачку. Настроіліся на доўгую барацьбу за сына і накіраваліся на абследаванні.

**Я ўпэўнена,**
**што мае дзеці перамаглі свае хваробы таму,**
**што заўсёды адчувалі побач з сабой моц нашай вялікай сям'і.**

Радасных прагнозаў бацькі не чулі: у будучыні магчымы ДЦП, цяжкі рэфлюкс і нейрасэнсорная глухаватасць на абодва вухі. Яшчэ ў тры месяцы хлопчык не мог трымаць галаву і не адчуваў апоры пад ножкамі. Але неўзабаве падазрэнне на ДЦП не пацвердзілася. Хлопчык дома, пад наглядам любячых бацькоў і спецыялістаў, хутка нагнаў сваіх равеснікаў у руках. З рэфлюксам давялося шмат папрацаваць. Дзіця не магло есці. Да года жыў толькі на грудным малацэ. Іншыя стравы адразу выходзілі з яго. Але ўсё ж патроху ён стаў есці некаторыя віды дзіцячага пюрэ.

— Гэта быў няпросты час, — успамінае жанчына. — Юры трэба было есці, але ён з цяжкасцю прымаў ежу і адразу ж патрабаваў запіць. Як толькі рабіў глыток, уся ежа адразу выходзіла і нашы намаганні накарміць заканчваліся няўдала.

Лекаў, якія былі патрэбны для лячэння гэтай хваробы, у Мінску не было. І бацькі Юры з вялікімі цяжкасцямі заказвалі неабходнае для жыцця малога з Масквы за вялікія грошы. Але ў тры гады Юра перамог і гэты дыягназ. Праўда, дзіця па-ранейшаму заставалася глухім. З прычыны пастаянных атытаў у хлопчыка Алене даводзілася часта ляжаць у бальніцах.

Да пяці гадоў Юра перажыў некалькі наркозаў з розных прычын. Але неўзабаве малому зрабілі кахлеарную імплантацыю (ужывілі ў скроневую вобласць і ў вушную ракавіну тытанавую пласціну з правадкамі, якія звонку прымацоўваюцца да спецыяльнага апарата) дзякуючы якой дзіця цяпер можа чуць. Малы хоць і мае інваліднасць, але жыве актыўным паўнавартасным жыццём: наведвае спецыялізаваны садок, гуляе з дзецьмі і можа чуць матулін голас.

— Мы спадзяёмся, што да сямі гадоў Юра зможа навучыцца добра размаўляць, — гаворыць Алена. — І тады мы накіруемся ў звычайную школу... Усё гэта перажыць мне дапамагла мая сям'я. І свякроў, і мая маці, і мой муж заўсёды былі побач, асабліва ў самыя цяжкія моманты нашага жыцця. Усе мы прайшлі праз боль і адчай разам, падтрымліваючы адно аднаго. Я ўпэўнена, што мае дзеці перамаглі свае хваробы таму, што заўсёды адчувалі побач з сабой моц нашай вялікай сям'і.

Алене ў хуткім часе споўніцца трыццаць. Але, нягледзячы на свой малады ўзрост, яна праз выпрабаванні прыйшла да жыццёвых высноў, да якіх многія ідуць усё жыццё і, на жаль, не заўсёды прыходзяць... Жанчына разумее, што сям'я — бясцэнны дар для чалавека. Ніколі не будзе ўхіляцца, калі яе родным спатрэбіцца дапамога, бо ведае, наколькі моцна могуць раніць некалькі слоў, кінутых раўнадушна. Менавіта таму вельмі ўважліва ставіцца да тых, хто сустракаецца на яе жыццёвым шляху.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

■ Абліваем ножкі!

# ШТО ГАЛОЎНАЕ Ў ЗАГАРТОЎЦЫ?

**Дашкалят можна і трэба загартоўваць. Неабходна толькі ўлічваць стан здароўя дзіцяці і... яго жаданне. Вядома, малому можа не спадабацца нейкая працэдура, значыць, трэба на пэўны час ад яе адмовіцца. Загартоўванне павінна прыносіць толькі станоўчыя эмоцыі! Яшчэ дзве важныя ўмовы — паступовасць і сістэматычнасць.**



**Памятка**

- **Заўсёды ўлічвайце стан дзіцяці, аднак памятайце, што вынік з'явіцца толькі калі будзе сістэмнасць.**
- **Самае эфектыўнае — абліванне ступняў і галёнак то цёплай, то халаднаватай вадой (заканчваць трэба халаднаватай, калі арганізм не аслаблены).**
- **Не трэба забывацца на звычайнае абціранне.**
- **Не падтрымлівайце інтэнсіўнае загартоўванне. Не трэба абліваць дзяцей на снезе, прымушаць хадзіць па ім басанож, акунаць у палонку. Усё гэта — моцны стрэс для арганізма, наступствы якога цяжка прадказаць.**

Самая вядомая загартоўка ў паўсядзённым жыцці — хада басанож, «шырокае» ўмыванне, праветрыванне кватэры. Аднак існуюць і спецыяльныя методыкі: абліванні ног, кантраснае абліванне, абціранне і купанне ў адкрытых вадаёмах, нагадвае **ўрач-рэнтгенолаг 3-й дзіцячай клінічнай паліклінікі г. Мінска Віялета МЯЦЕЛЬСКАЯ.**

Паветраныя ванны. Самае тое, з чаго варта пачынаць. Тэмпература паветра павінна быць не вышэйшай за +26 і не ніжэйшай за +17 градусаў, інакш гэта будзе або перагрэў, або прастуда. Вельмі добра спалучаць паветраныя ванны з ранішняй зарадкай. Праветрыце памяшканне, апраніце дзіця ў майку, трусікі і шкарпэткі (калі дзіця прызвычаіцца займацца ў халаднаватым памяшканні, можна будзе займацца басанож).

**Як умываемся?** Тэмпературу вады можна зніжаць паступова. Умыванне павінна быць «шырокім» — не толькі кісці і твар, але і рукі да локцяў, шыю, верхнюю частку грудзей.

**Як спім?** Тэмпература паветра падчас сну павінна быць на 2-3 градусы ніжэйшай, чым тая, што была ў пакоях днём. Перад сном памяшканне трэба праветрыць або пакінуць фортку адчыненай, калі на вуліцы не надта холадна. Важна, каб не было скразняку. Для дзяцей да 3 гадоў тэмпература падчас сну павінна быць каля 21-23 градусаў, у 3-5 гадоў — 20-21, 5-7 гадоў — 19-21.

**Як апранаемся?** Пры тэмпературы ў кватэры вышэйшай за 23 градусы дастаткова бялізны і тонкага баваўнянага адзення. 18-22 градусы — можна апрануць калготкі і кофту з больш грубай бавоўны з доўгім рукавом, 16-17 — цёплая кофта, калготкі і цёплыя тапачкі.

**Як ходзім?** Некаторыя дзеці вельмі любяць хадзіць басанож. Аднак зусім малым шкодна хадзіць падоўгу па цвёрдай паверхні: у іх яшчэ фарміруецца звод ступні, а жорсткая апора можа ўзмацніць нейкія парушэнні, паспрыяць плоскаступнёвасці. Бегаць з голымі ножкамі падчас выканання фізічных практыкаванняў лепей або па тоўстым дыване, або летам — па зямлі і траве.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

■ Вазьму твой боль...

# ЯК ПРАСІЦЬ, КАБ ДАВАЛАСЯ НАМ




**У дабрачынны «Клуб 5000» прыйшоў новы валанцёр. Дзянісу ўжо за трыццаць. Ён мае няўдалы вопыт шлюбу. Шукае новыя стасункі, але баіцца зноў апячыся. Псіхолаг параіла заводзіць знаёмствы ў кампаніях валанцёраў, а лепш — самому заняцца дабрачыннасцю. Маўляў, так і душу падлечыш, і пару сабе знойдзеш.**

Дзяніс прыйшоў на сход валанцёраў, сяброўскую сустрэчу, якую мы ладзім раз на два месяцы. У размовах не ўдзельнічаў, назіраў збоку. На развітанне пакінуў вялікую суму ахвяравання. І знік.

Праз год я сустрэла Дзяніса ў выпадковай кампаніі. Ён па-ранейшаму адзін. І па-ранейшаму ў пошуку. Лічыць, што яму не пашчасціла ў нашым клубе і псіхолаг не мела рацыі. Ён зрабіў усё, як рэкамендавалі. А валанцёркі за сталом сустрэчы — палова ўжо замужам, палова не на яго густ. Засталася толькі парачка прыдатных кандыдатур. Ён і грошы ахвяраваў, а чаканага выніку так і не атрымаў. Не працуюць на ім ніякія схемы. Так Дзяніс расчараваўся ў дабрачыннасці.

Калі я спытала ў хлопца пра тыя пару кандыдатур з нашых дзяўчат, што прыйшліся яму даспадобы, ён не змог прыгадаць і апісаць іх. На пытанне «якой павінна быць дзяўчына, каб запасці табе ў душу?» таксама адказу не знайшоў. Ён так і не вырашыў, каго шукае і чаго хоча ад жыцця. Гэта першая памылка Дзяніса. А другая — жаданне лёгкага хлеба. Варта мне толькі захацець, працягнуць руку... Ну, купіць, урэшце рэшт, ён жа заплаціў ахвяраванне за сваё патэнцыяльнае каханне. А яно так і не прыйшло.

Каб атрымаць жаданае, трэба ўмець прасіць. Я памятаю, як адна знаёмая шукала офіс для сваёй справы. Стары яе не задавальняў, змяніць дуплятае на прабітае не хацелася, а будынак мары ніяк не знаходзіўся. Раптам даведваюся: пераязджае. На наваселле офіса Ала Пятроўна сабрала сваіх сяброў, пасадзіла ў кола і стала зачытваць дзённікавыя запісы. Калі яна страціла надзею знайсці будынак сваёй мары, то села і напісала: праз два тыдні мая кампанія заедзе ў светлы, прасторны офіс з шасцю кабінетамі. Яна распісала план уяўнага памяшкання з падрабязнасцямі даўжыні калідораў і пейзажу за вокнамі.

— А цяпер можаце агледзецца, прагуляцца, — запрасіла Ала Пятроўна.

Мы былі ў шоку. Апісанне супадала да дробязяў. Яе ўяўленне так маляўніча распісала патрэбнае месца, што мара ажыла.

Упершыню прымяніць вопыт Алы Пятроўны мне давялося на дзявочніку з сяброўкамі. Мы пусцілі па коле аркуш паперы, дзе запісвалі пажаданні для самых сябе. Праз год мусілі паглядзець, што спраўдзіцца. З усіх дзяўчат ажылі толькі мае жаданні. Бо, у адрозненне ад іх «быць шчаслівай і здаровай», я падрабязна распісала свае складнікі шчасця на той момант. Нават келіхі для шампанскага з'явіліся ў маім жыцці на тых самых чорных ножках, з якімі я жадала іх бачыць.

Такім чынам, правіла першае — уявіць сваё жаданне так падрабязна, быццам яно ўжо даўно спраўдзілася, убачыць яго так блізка, нібыта яно намазоліла вочы. Згодна з гэтым правілам, для расчараванага валанцёра Дзяніса час вызначыцца, якімі рысамі павінна валодаць яго будучая жонка.

...Мой сябра пасля школы не прайшоў уступныя іспыты, не скарыў навучальную ўстанову сваёй мары. У скрусе правалу кінуў мне папрок: «Што ты заладзіла са сваім «папрасі, памаліся»! Я нават пярсцёнак у царкоўнай лаўцы набыў. «Выратуй і захавай» напісана. І на іспыт яго надзеў. Не дапамагло!»

Ён таксама лічыў, што дастаткова захацець і працягнуць руку. Ну, ці заплаціць за сваё жаданне. А жаданне трэба заслужыць. Каму год, каму два, каму за дзень даецца, а каму і ўсё жыццё. І тут важны працэс служэння. Не таргавацца з Богам: «Я паслужу, а Ты мне спраўдзі запаветнае». Тут шчырасць патрэбна.

Напрыклад, так: «Я з усёй душой да Цябе: і пахрысціўся, і крыжык нашу, і храм наведваю, і не крыўджу нікога. І, калі Табе так заўгодна, дапамажы мне здаць іспыты. І незалежна ад выніку, я не адмоўлюся ад служэння. Бо яно не дзеля паступлення, яно ж па шчырасці».

Ці так: «Я буду вучыцца. Кніжкі чытаць, задачы рашаць. Гэта спатрэбіцца мне і ў прафесіі, і ў жыцці. Пры паступленні дапаможа. Нават калі не складзецца з інстытутам, не, ды ўсё роўна не прападуць. Я ж не для іспытаў вучуся — для сябе, для будучыні».

Замацуем правіла другое — мару трэба заслужыць, і заслужыць з чыстым сэрцам. А валанцёру Дзянісу варта было б бліжэй пазнаёміцца з дзейнасцю дабрачыннага руху, уключыцца ў праекты, прыняць удзел у акцыях, стаць пастаянным дзеячам. Так можна пазнаёміцца не толькі з дзяўчатамі, што прыйшлі на сустрэчу «Клуба 5000», але і з тымі, што не здолелі быць у той дзень у тым месцы. А з цягам часу — пазнаёміцца і з новымі валанцёркамі, якія далучацца пазней, як калісьці сам Дзяніс. Ды наша справа — гэта бясконцыя знаёмствы. Ёсць выпадковыя людзі, тыя, што разова перадаюць падарункі, дапамагаюць перавезці грузы, выступаюць на мерапрыемствах ці проста зводзяць нас з іншымі людзьмі. Варта толькі затрымацца. І паслужыць. Не дзеля сваёй мэты — ад шчырага сэрца.

...На працягу дзесяці гадоў я атрымлівала на дзень нараджэння як мінімум два аднолькавыя падарункі. На шаснаццацігоддзе — дзве начныя сарочкі, на сямнаццаць — два фены, на васямнаццаць — дзве пары шлёпанцаў... Гэта была не традыцыя, не розыгрыш. Проста так супадала. Я прызвычаілася і нават чакала: што на гэты раз.

А потым вырашыла скласці ліст жаданняў. Цэлы год старанна запаўняла нататнік, падрабязна ўяўляла і апісвала кожную мару. А напярэдадні свайго свята даслала спіс ахвотным. І нічога не чакала. Калі нехта з сяброў дапаможа спраўдзіць мару — так таму і быць. Калі не — не хвалююся. І імкнуся заслужыць. Кожнаму жаданню — свой час. І на кожную мару — нехта адзін, хто зможа спраўдзіць яе.

А вынік быў ашаламляльны. У канкрэтным спісе, дзе розныя чалавекі маглі б выбраць адзін і той жа пункт для рэалізацыі, нарэшце, не здарылася паўтораў у падарунках! Проста дасканала абдумвайце свае мары, фармулюйце іх, дасылайце запыт у Сусвет і шчыра заслугоўвайце.

Дзень нараджэння на падыходзе. Спіс жаданняў гатовы. Дапішу-ка я ў яго навесту для Дзяніса, няхай вяртаецца па яе ў «Клуб 5000».

**Таццяна НЕМЧАНІНАВА, заснавальніца дабрачыннага руху «Клуб 5000».**

# ЧЫМСЬЦІ СМАЧНЕНЬКІМ ЗАПАХЛА...

## Як палюбіць гатаваць?

**Самае вялікае ўражанне ад першай паездкі ў Польшчу (гэта было дастаткова даўно) мая сяброўка атрымала, убачыўшы, як мала часу польскія жанчыны праводзяць на кухні. «Уяўляеш, там столькі ўсялякіх паўфабрыкатаў у крамах! — захлёбваючыся распавядала яна. — Марыя (далёкая сваячка, у якой яна з мужам спыняліся) ля пліты амаль не стаіць. Дастаць гатовую салату з упакоўкі, разагрэць страву ў мікрахвалевай печцы — усе яе клопаты. Гэта ж колькі часу вызваляецца! А я... сняданак прыгатуй, вячэру падай... а ў нядзелю, бывае, амаль цэлы дзень праводжу на кухні!..»**

Сучасныя дзяўчаты, сапраўды, гатаваць кожны дзень абед ці вячэру ўжо не жадаюць. Ім шкада і часу, і сіл. Не, умець спячы які-небудзь торцік або прыгатаваць яшчэ парачку святочных страў хацела б кожная, але стаяць ля пліты штодня — не, выбачайце...

Мужчыны звычайна супраць такога, бо жадаюць бачыць у доме сапраўдную гаспадыню. Жанчына павінна ўмець накарміць сям'ю, лічаць яны, а не «падсаджваць» яе на бутэрброды і пельмені з крамы. Як бачым, у кожнага свая логіка.

А праўда жыцця, напэўна, у тым, што, нават калі жанчына вельмі любіць гатаваць, яна хацела б рабіць гэта час ад часу, але не кожны дзень. Таму што вось гэтае абавязацельства «стамілася не стамілася — ідзі на кухню», пагадзіцеся, наўрад ці каму па душы. Але простага выйсця з гэтай сітуацыі, асабліва калі жанчына замужам і ў яе ёсць дзеці, няма. Або стаяць пасля працы ля пліты, або рэальна шмат зарабляць. Як варыянт — мець мужа, які шмат зарабляе. Тады ўсё цудоўна вырашаецца: абедамі і вячэрамі ў кавярні некалькі разоў на тыдзень ці дастаўкай гатовай ежы з рэстарана.

Але тут ёсць свае падводныя камяні... Нядаўна я паглядзела фільм «Сцёртая рэальнасць». Успамінаю сцэну, калі на канікулы да сямейнай пары прыехаў сын-падлетак, які вучыўся ў іншым горадзе. Бацькі яго сустрэлі ў аэрапорце, як мае быць, прывезлі дадому. А далей... «Штосьці я стамілася, — сказала маці. — Пайду пасплю». Бацька дастаў з халадзільніка бутэльку піва. «Будзеш?» — спытаў у сына. «Не», — адказаў той і адправіўся ў свой пакой глядзець тэлевізар. Нават калі б вы пачалі глядзець фільм з гэтага эпізоду, ужо зразумелі б, што нешта з гэтай сям'ёй не так. Яны не ядуць разам! Нават кубачак гарбаты разам не выпілі! І адразу з'яўляецца адчуванне холаду і адзіноты.

Так што як не круці, а прыгатаваная ежа, у першую чаргу, — сімвал утульнага дома. Таму гатаваць усё ж такі давядзецца. І лепш рабіць гэта з любоўю.

Выпадак досыць рэдкі, але адной маёй знаёмай палюбіць гатаваць дапамагла новая праца. Год таму Вольга стала працаваць менеджарам у кулінарнай школе (у Мінску такія сталі ўжо адкрывацца). Да гэтага яна магла час ад часу прыгатаваць штосьці зусім простае: элементарную салату з агуркоў і памідораў, мюслі размачыць у малацэ, бульбу ці яечню пасмажыць, зварыць макароны... Затрымлівалася на кухні Вольга вельмі рэдка: не бачыла ў гэтым асаблівага сэнсу (бо жыла з мамай, і гатавала ў асноўным тая), ды і не было асаблівага жадання. «Цяпер я маю магчымасць прысутнічаць на розных майстар-класах ад шэф-кухараў мінскіх рэстаранаў, — распавядае Воля. — Чалавек, у якога кулінарыя — хобі, мог бы ўзяць ад маёй працы максімум. Я да такіх не належу, але, тым не менш, нейкія маленькія хітрасці, прыёмы, рэцэпты я ўжо прыўнесла ў сваё жыццё. Ды і кругагляд мой значна пашырыўся. Пазнаёмілася з новымі прадуктамі — рознымі відамі ліставых салатаў, спецыямі, духмянымі травамі, навучылася рабіць цікавыя соусы. Цяпер я даволі хутка магу прыгатаваць лёгкую, прыгожую і карысную страву з цікавым смакам, выкарыстоўваючы шмат зяленіва, гароднiны і якую-небудзь запраўку. Самае галоўнае — ставіцца да гатавання я пачала, як да занятку прыемнага, цікавага і творчага. Цяпер мне падабаецца спалучаць розныя прадукты і смакі. Кулінарыя, аказваецца, гэта цэлы свет...»

А як палюбіць гатаваць астатнім? «Я прыйшла да гэтага так: па-першае, заўсёды ўключаю вясёлую музыку, калі раблю нешта на кухні, каб падняць настрой і быць у тонусе, — распавядае маладая мама Аксана Прыходзька. — І сама спяваю часам... Па-другое, шукаю цікавыя рэцэпты (вельмі смачных і нескладаных рэцэптаў — процьма)». Аксана раіць выкарыстоўваць маленькія хітрасці, каб аблягчыць працэс і зменшыць час гатоўкі. «Калі я працавала, мне яны вельмі дапамагалі, — кажа жанчына. — Напрыклад, загадзя перамалоць у блэндары моркву, цыбулю, зяленіва, змяшаць іх з соллю, утрамбаваць у стэрылізаваны слоічак, шчыльна закрыць — і запраўка для супу заўсёды пад рукой. Або выдаткаваць дзянёк на прыгатаванне «замарозкі». Можна наляпіць пельменяў, варэнікаў, зрабіць галубцы, бульбяныя клёцкі, фаршыраваныя перцы, блінцы з рознымі начынкамі. Здробненую моркву таксама можна замарозіць. Усе гэтыя прадукты не губляюць смак пасля размарозкі. Забіць імі маразілку — і менш будзе працы ў будні... А яшчэ: шторы, посуд, аксесуары на кухню выбірайце, як сукенкі! Гэта таксама важна для стварэння настрою!».

Кадры з фільма «Джулі і Джулія»





Да таго ж у наш час прапануецца шырокі выбар рознай бытавой тэхнікі: міксеры, блэндары, сокавыціскалкі і іншае — усё гэта аблягчае працу хатняй гаспадыні і зводзіць да мінімуму наша знаходжанне на кухні. Ёсць і іншыя маленькія хітрасці.

Бухгалтар Марына Танкачова ладзіць сабе вольны ад гатоўкі дзень хаця б раз на тыдзень, каб не адчуваць сябе абдзеленай, калі муж увечары адпачывае, а яна стаіць ля пліты. «Я лічу, што фастфуд адзін раз на тыдзень — гэта не смяротна...» — кажа Марына.

Так што кожны прыходзіць да прымірэння з кухняй і нават любові да яе сваім шляхам. Ну, а тым, хто шукае натхненне, раю паглядзець выдатны фільм «Джулі і Джулія». Ён — пра дзвюх цудоўных жанчын, якім не хапала «разыначкі» ў жыцці, і яны знайшлі яе ў кулінарыі. Менавіта кухня, як ні дзіўна, дапамагла ім выкараскацца з руціны будняў, зрабіць сваё жыццё больш яркім і цікавым. Фільм сапраўды выклікае жаданне пастаяць ля пліты! Растапіць сметанковае масла, размяшаць у місцы шакаладную масу, дастаць з духоўкі цудоўна запечанае мяса...

**Святлана БУСЬКО.**

## Чырвоны боршч

**Напрыканцы фільма «Масква слязам не верыць» галоўная гераіня разлівала па талерках боршч, калі Гоша спытаў, ці ёсць што-небудзь на вячэру...**

***Інгрэдыенты:***

*Буракі — 1 кг*
*Грыбы сушаныя — 50 г*
*Ялавічны булён — 2,5 л*
*Рэпчатая цыбуля — 80 г*
*Морква — 1 шт.*
*Часнок — 2 зубчыкі*
*Сок аднаго лімона*
*Яблык кіслы — 1 шт.*
*Соль, перац, маяран, базілік*

Грыбы старанна вымыйце і замачыце ў халоднай вадзе, а потым звaрыце ў гэтай жа вадзе асобна ад іншых кампанентаў. Калі будуць гатовы, адвар зліце. Нарэжце буракі і цыбулю скрылікамі. Яблыкі разрэжце на долькі. Часнок падзяліце напалам. Моркву нарэжце кубікамі.

Падрыхтаваную гародніну заліце халодным вадой або халодным празрыстым булёнам, дабаўце грыбы і ўсе прыправы. Варыце хвілін 15 пасля закіпання (боршч не павінен доўга варыцца, каб захаваўся колер і водар буракоў). У канцы варкі ўліце лімонны сок і ўкіньце парэзаны яблык.

Гатовы боршч пастаўце ў халоднае месца да наступнага дня, калі яго смак стане больш насычаным. На наступны дзень давядзіце да кіпення, разліце па талерках, запраўце смятанай і падавайце. Да гэтага баршчу можна падаць часночныя булачкі.

■ Вясновыя клопаты

# МЫЕМ ВОКНЫ ХУТКА І ЯКАСНА

**З надыходам цёплых сонечных дзён многія гаспадыні з тугой пазіраюць на вокны, якія за зіму паспелі пакрыцца налётам пылу і бруду. Час брацца за справу. Напэўна, вы ўжо даўно знайшлі свой спосаб, як гэта зрабіць хутка і якасна. Аднак іншы раз не пашкодзіць зазірнуць у чужыя сакрэты — а раптам даведаешся пра што-небудзь карыснае для сябе.**



Хімічная прамысловасць зрабіла вялікі крок наперад, і сёння ў продажы можна знайсці вялікае мноства розных сродкаў для мыцця вокнаў, люстэркаў і іншых шкляных вырабаў. Усе яны вырабляюцца на аснове спірту з дабаўленнем араматызатараў. Аднак заўсёды трэба памятаць, што акно — гэта не толькі шкло, а яшчэ і драўляная або пластыкавая рама, таму раствор для шкла не павінен пашкодзіць раму. Напрыклад, сода выдатна адмые шкло, але ўсё ж не рэкамендуецца для гэтай працэдуры, таму што ад соды жаўцее белая фарба. Акрамя соды, не рэкамендуецца карыстацца гаспадарчым мылам і мыйным парашком. Тады чым і як памыць вокны?

Спачатку варта прыслухацца, што раяць спецыялісты. Для мыцця і пастаяннага догляду вокнаў з ПВХ яны рэкамендуюць набываць вадкія саставы, якія спецыяльна распрацаваны для выдалення забруджванняў з пластыку і не змяшчаюць абразіўных рэчываў, што драпаюць паверхню, ці растваральнікі, што пазбаўляюць пластык гладкасці і бляску, а іншы раз нават колеру. Таксама для догляду за пластыкавымі вокнамі можна выкарыстоўваць звычайныя сродкі для мыцця посуду ці мыльны раствор, які наносяць на мяккую сурвэтку, а пасля лёгка выдаляюць з паверхні разам з вадой. Асаблівую ўвагу звярніце на металічную фурнітуру і гумавыя ўшчыльняльнікі: фурнітуру пасля мыцця і высыхання змажце машынным маслам, а на гумавыя ўшчыльняльнікі нанясіце спецыяльную сіліконавую змазку.

Драўляныя рамы трэба не мыць, а праціраць пры дапамозе вільготнай сурвэткі. Для выдалення забруджванняў з паверхні драўляных рам лепш выкарыстоўваць сродкі, якія чысцяць і абараняюць драўніну. Яны асвяжаюць знешні выгляд лакафарбавага пакрыцця і забяспечваюць надзейную абарону ад атмасферных уздзеянняў. Як варыянт: для мыцця драўляных рам можна прымяняць сродкі для догляду мэблі.

Каб не пашкодзіць пакрыццё, не працірайце паверхні драўляных вокнаў мыйнымі сродкамі, якія змяшчаюць кіслату, абразіўныя рэчывы і растваральнікі.

Калі вы не жадаеце ўжываць гатовыя хімічныя сродкі, то дзверы і аконныя рамы можна вымыць вадой з нашатырным спіртам (на 1 л вады 1 сталовая лыжка нашатырнага спірту). Дзверы і рамы цёмнага колеру ці пакрытыя каляровай фарбай добра адмываюцца цёплым настоем чаю (2 чайныя лыжкі сухога чаю на 1 л гарачай вады).

**Для мыцця шкла можна прыгатаваць наступныя растворы.**

**1.** Для моцна забруджаных вокнаў падыходзіць мелавы раствор: дзве сталовыя лыжкі тоўчанага мелу на літр цёплай вады. Гэтай сумессю пратрыце шкло, пасля чаго змыйце чыстай вадой. Анучы для мыцця вокнаў лепш выкарыстоўваць ільняныя. Іх спатрэбіцца тры, прычым пажадана не выкарыстоўваць гэтыя анучы для нейкіх іншых патрэб. Першай анучай, злёгку адціснутай, намажце шыбу раствором мелу, другой, крыху вільготнай, збярыце бруд і дайце шклу падсохнуць, але не перасушыце. Трэцяй анучай пратрыце.

Многія гаспадыні па старых звычках замест анучы выкарыстоўваюць газетную паперу. Ад гэтага на вокнах не застаецца ні плямаў, ні разводаў. Даволі працаёмкая працэдура, але цалкам надзейная.

**2.** Для надання бляску вашым вокнам шкло можна прамыць вадой з дабаўленнем воцату ці солі.

Мыць вокны лепш у пахмурнае надвор'е. А пры мыцці вокнаў на кухні прасачыце, каб у вас нічога не кіпела на пліце.

**3.** І яшчэ адзін спосаб адмыць вокны і надаць ім бляск і празрыстасць — набыць спецыяльныя сурвэткі, выраблены з мікрафібры ці мікравалакна. Такія сурвэткі выдатна адмываюць нават самыя брудныя вокны і не пакідаюць пры гэтым слядоў.

# Сезонныя рэчы — на захоўванне

**Цяпер, калі магчымасць вяртання моцных халадоў ужо малаверагодная, можна схаваць цёплае адзенне на захоўванне. Як зрабіць гэта правільна?**



Спачатку ўважліва агледзьце зімовыя рэчы, адкладзіце тыя, што трэба пачысціць і адрамантаваць. Адрамантаванае верхняе адзенне старанна прасушыце. Рабіць гэта трэба ў пакоі на скразняку ці на адкрытым паветры ў цені. На сонцы трымаць футравыя рэчы не рэкамендуецца, бо светлае футра можа пажаўцець. Пачысціць забруджаныя вырабы можна пры дапамозе падагрэтага ржанога ці пшанічнага вотруб'я: пасыпце футра гарачым вотруб'ем, патрыце яго асцярожна рукамі, потым пачысціце шчоткай і вытрасіце. Белае і светлае футра добра чысціццаface маннымі крупамі і крухмалам.

Паліто з футравым каўняром і футра найлепш захоўваць у спецыяльных чахлах ці павесіць на плечыках у шафу, папярэдне расклаўшы сродкі ад молі. З «народных» сродкаў ад молі добра абараняюць галінкі багуну ці герані.

Пачысціць ад плям ці памыць трэба і ўсе цёплыя світары. Чыстыя рэчы пакладзіце ў дальні куток шафы. А яшчэ лепш завесці паліцы ў шафе спецыяльна для зімовага і летняга адзення. Няма паліцы — можна скарыстаць стары чамадан ці кардонкі. Таксама паклапаціцеся пра сродкі ад молі.

Уважлівага догляду патрабуе і зімовы абутак. Адрамантаваны і пачышчаны абутак добра прасушыце, змажце крэмам, напхайце ўнутр паперу, каб захаваць форму, і пакладзіце ў кардонкі. Заадно ў вас ёсць магчымасць правесці «рэвізію» свайго абутку. Можа здарыцца так, што вашы паліцы стануць больш умяшчальнымі, калі вы прыбераце абутак, які даўно не носіце, бо ён ужо не прыдатны па памеру, выйшаў з моды ці проста згубіў знешні выгляд.

Гэта датычыцца і іншых паліц. Часта ў шафе няма месца не таму, што ў вас шмат адзення, а таму, што яна перагружана ў склад непатрэбных рэчаў. Чамусьці выкінуць іх рука не падымаецца, і тады з часам старыя рэчы пачынаюць нас выжываць з жыццёвай прасторы. Падрыхтоўка цёплага адзення да захоўвання можа стаць якраз нагодай для перагляду гардэроба.

■ Фотаздымак з гісторыяй

# ІХ ЗАБРАЛА ВАЙНА...

**«Мяне завуць Каця Брыкава. Жыву ў аграгарадку Цяхцін, што ў Бялыніцкім раёне Магілёўскай вобласці. Вучуся ў 9-м класе. Мая бабуля Ганна і дзядуля Пеця жывуць непадалёку ад нас, у вёсцы Пільшычы. Разам з татам, мамай і братам Дзянісам часта наведваю іх. Дапамагаю ва ўсім.**

Бабуля любіць чытаць вашу газету, выпісвае яе. Менавіта яна мне расказала пра сваіх сваякоў — сям'ю Кіпцікавых. Дзядуля Сафрон і бабуля Марыя жылі ў вёсцы Пільшычы. Было ў іх 7 дзяцей: 5 дачок і 2 сыны. Старэйшы сын Андрэй нарадзіўся ў 1890 годзе, малодшы Пётр — у 1904-м. Дочкі — Крысціна, Поля, Ганна, Фёкла, Хіма — усе выйшлі замуж, жылі асобна. Сын Андрэй яшчэ да вайны працаваў доктарам у Магілёве. А Пётр застаўся жыць з бацькамі. У яго яшчэ да вайны нарадзіліся 2 дачкі.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, немцы многіх жыхароў вёскі Пільшычы расстралялі 29 жніўня 1941 года. Трапіў у гэты чорны спіс і Пётр. Сястра Хіма папала пад бамбёжку і загінула.

Нікога ўжо з вялікай калісьці сям'і не засталося, акрамя дачкі Пятра — Ніны. Яна жыве ў вёсцы Пільшычы, ёй 82 гады.

Мая бабуля ходзіць яе праведваць. Гэта Ніна Пятроўна ёй усё расказала пра сваю сям'ю і аддала даваенныя фотаздымкі, якія ўцалелі ў час вайны,


Бабуля Марыя і дзядуля Сафрон, прыблізна ў 30-я гады ХХ стагоддзя.

бо Пільшычы фашысты спалілі 22 сакавіка 1943 года...»

* * *

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома (за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей). Вам ёсць што паказаць і расказаць? Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі з гісторыяй (не больш за тры) дасылайце з адпаведнай паметай на паштовы адрас (220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10 а) або электронны — info@zvyazda.minsk.by. Аўтар найлепшага фота з гісторыяй будзе адзначаны прызам. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца аўтарам.***


Браты Андрэй (сядзіць) і Пётр.

# ЗАГАДКІ ДЗЕДА КАНДРАТА

(Кандрата Крапівы)

**Чуйце, хлопчыкі, дзяўчаткі!**
**Прапаную вам загадкі**
**Для гульні цікавай, новай —**
**Трэніроўкі разумовай.**
**Як з людзьмі гамонім мы,**
**Чуюцца амонімы —**
**Словы двухаблічныя,**
**Не для ўсіх прывычныя.**
**Як іх разгадаеце,**
**Вестачку мне дайце —**
**Я сардэчна буду рад.**
**З прывітаннем,**

*Дзед Кандрат.*



## БАБКІ

Розных бабак шмат на свеце.
Тры з іх добра я прымеціў:
Біў адну я малатком,
Еў другую з малаком,
А трэцяя бабка —
Карэньчык ды шапка.

*(Бабка I. Маленькая кавадла для клепання касы. Бабка II. 1. Здобны пірог. 2. Бульбяная запяканка. Бабка III. Грыб (падбярозавік).)*

## ЖУРАЎЛІ

Журавель лунае
Той, што крылы мае,
А другі, бяскрылы,
Напружвае сілы,
Каб дастаць вадзіцы
Слаўнай маладзіцы.

*(Журавель I. Пералётная балотная птушка. Журавель II. Прылада для даставання вады з калодзежа.)*

## БАБЫ

Хоць на словах і радня,
Баба бабе на раўня,
Між сабой яны не ладзяць:
Адна б'е, другая гладзіць.
Тая з маху як ударыць —
Аж зямля калоціцца;
Гэта варыць, гаспадарыць,
Аб усіх клапоціцца.

*(Баба I. Прылада для забівання паляў моста і г.д. Баба II. Бабуля.)*

## КАСА

Я касой траву кашу
У зялёным лузе,
А другую я нашу
Пастаянна ў пузе.
Трэцюю, я вам скажу,
Носіць мая дочка,
На чацвёртай я ляжу —
Грэюся ў пясочку.

*(Каса I. Сельскагаспадарчая прылада. Каса II. Падстраўнікавая залоза, селязёнка. Каса III. Жаночая прычоска. Каса IV. Вузкая, доўгая мель, звычайна пясчаная.)*

## ГЛЯДЗІ Ў КОРАНЬ

Як рыдлёўку я прыдбаю,
Корань дрэва адкапаю,
А вось іншы каб здабыць,
Трэба ўжо вучоным быць.
І не трэба тут рыдлёўка —
Хопіць простага алоўка.

*(Корань I. Падземная частка расліны. Корань II. Велічыня, якая пры ўзвядзенні ў пэўную ступень, дае патрэбны лік (у матэматыцы).)*

## СОЛЬ

Ужываю я дзве солі,
Калі гэта мне да месца:
Без адной я невясёлы,
Без другой — абед не есца.

*(Соль I. Нота. Пяты гук музычнай гамы, якая пачынаецца з «до». Соль II. Сталовая соль.)*

■ Пясочніца

## ДЛЯ ПРАФОРМЫ

— Мама, — гукае з кухні 5-гадовая Даша, — можна мне яшчэ адзін бліньчык?

— Можна, бяры.

— Я ўжо ўзяла! — скрозь задаволенае чмяканне інфармуе дзіця.

## ЯК СКАЗАНА, ТАК І ЗРОБЛЕНА

Марышку (2,5 года) мама корміць з лыжачкі:

— Давай, дачушка, за маму, за тату... Цяпер за цётку Аню...

Працэс запавольваецца. Праз пару хвілін мама прапаноўвае:

— Яшчэ лыжачку за бабулю?

— Не! — абураецца малая і паказвае пальцам у лыжку. — Там яшчэ цётка Аня!

## ВЯЛІКІЯ ПЛАНЫ

— Наташа, — пытаюцца дзядуля і бабуля ў 6-гадовай унучкі, — ты ўжо вырашыла, кім хочаш стаць, калі вырасцеш?

— Ну... Лепш за ўсё, вядома, жонкай, — разважліва адказвае дзяўчо.

## ЧЫМ ПАХНЕ МАТЫЛЁК?

Маленькаму Пашу набылі прыгожае дзіцячае мыла ручной работы — у форме матылька. Увечары, мыючы рукі, хлопчык старанна прынюхваецца:

— Як смачна пахне — матылькамі!

## ПАКАЛЕННЕ NEXT

— Косця, ты чаму яшчэ не спіш? — здзіўлена пытаецца бацька ў сына.

— Я чакаю, пакуль сны спампуюцца, — паўсонна адказвае малы.

## ПАРАЙЦЕСЯ З УРАЧОМ

Чатырохгадовая Ліза гуляе ў доктара:

— Вось вам рэцэпт на аналізы — прымайце тройчы на дзень, пасля ежы.



# ЦЯГНІК ЗАБАЎ

(для малечы)

### Лабірынт



### Знайдзіце 10 адрозненняў



### Прыказкі пра сяброўства

- Не той сябра, хто вусны мёдам мажа, а той, хто ў вочы праўду кажа.
- З кім пазнаешся, такім і сам станешся.
- Той не можа быць другам, хто абыдзе ў бядзе кругам.
- Не карай, Божа, нічым, як сябрам ліхім.
- Лепш сто сяброў, як сто рублёў.
- Новых сяброў набывай, але старых не забывай.
- Гара з гарою не сходзяцца, а чалавек з чалавекам заўсёды.

### 3D малюнак



Вядучая рубрыкі Алена БІЗУНКОВА.

*У народзе кажуць:* ***«СЯМ'Я ГУШЧУ ЛЮБІЦЬ».***

Адказная за выпуск Надзея ДРЫЛА.

## Друкуецца ў «Полымі»

*Леў Леанідавіч Колесаў — вядомы ў нашай краіне і за яе межамі філатэліст. Доўгі час ён узначальваў Беларускі саюз філатэлістаў, сёння з'яўляецца намеснікам старшыні гэтага грамадскага аб'яднання. Чытачы часопісаў «Полымя» і «Нёман» пазнаёміліся са шматлікімі экспанатамі яго калекцыі і калекцый яго сяброў, прысвечаных Беларусі. Так, напрыклад, у часопісе «Полымя» (№ 4, 2015 года) быў надрукаваны невядомы ліст Якуба Коласа, што захоўваецца ў прыватным зборы ў Германіі.*

*Аднак нашы рэдакцыйныя размовы з Львом Леанідавічам часта выходзілі за «філатэлістычныя» межы, і мяне заўсёды здзіўляла яго здольнасць разглядзець і апісаць гэты свет, пражытае (якім бы цяжкім яно ні было), падрабязна і дакладна, як экзэмпляр калекцыі. Так у рэдакцыі часопіса «Полымя» з'явілася «Акупацыя» — самабытная дакументальная проза, распавед Льва Леанідавіча пра пачатак вайны і тры гады жыцця на тэрыторыі, захопленай фашыстамі, у маленькім Лунінцы. Цалкам успаміны надрукаваны ў №4 і №5 часопіса «Полымя» за 2015 год.*

**Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ.**

# ВАЙНА ВАЧЫМА 10-ГАДОВАГА

Ужо ў кастрычніку 1941 года акупацыйныя ўлады на чале з бургамістрам Якубікам урачыста адкрылі ў Лунінцы кінатэатр. Ён працаваў для насельніцтва некалькі дзён на тыдзень, сеансы заканчваліся да каменданцкай гадзіны, якая не асабліва вытрымлівалася. У вызначаныя дні кіно паказвалі толькі для немцаў. Некаторы час сеансы для лунінчан былі бясплатнымі. З дзяцей грошы не бралі ніколі. Хлопчыкі часцей за ўсё ўладкоўваліся на падлозе перад экранам. Паказвалі толькі нямецкія фільмы. Большасць гледачоў не разумела мовы, не ведала пра што ідзе размова, дзе адбываецца дзеянне і калі. Але некалькі фільмаў усё ж запомніліся. Каляровая стужка пра барона Мюнхгаўзена. Фільм з сюжэтам, падобным да «12 крэслаў». Фільм пра нямецкіх падводнікаў. Былі і рускамоўныя карціны. Двухсерыйны фільм «Жыд» — пра злых яўрэяў-масонаў у акружэнні прускага караля. Былі прапагандысцкія фільмы на рускай і ўкраінскай мовах — пра «цяжкую долю савецкіх людзей пад прыгнётам камуністаў і пра шчаслівае жыццё партыйцаў, нкусаўцаў, палітработнікаў-яўрэяў». Былі фільмы пра калгасы. Нешта паказвалі пра Катынь. Вялікім поспехам у немцаў карыстаўся тыднёвы агляд ваеннай кінахронікі. Калі на экране паказвалі савецкія аэрадромы з грудамі разбітых самалётаў, дарогі Беларусі, забітыя згарэўшай тэхнікай, палаючыя вуліцы захопленых гарадоў, натоўпы палонных, разгубленых чырвонаармейцаў і камандзіраў, забітых савецкіх байцоў каля разбітых гармат, а на гэтым фоне пераможны марш нямецкай тэхнікі — зала дружна апладзіравала. Няшмат мы, тады дзесяцігадовыя хлапчукі, разумелі ў гэтай вайне. Занадта многа падзей адбылося, пачынаючы з 1939 года. Але тое, што мы бачылі на экране, выклікала ў нас незразумелыя, можа, нам самім слёзы, крыўду, злосць. Так здаралася і са мною.

Аднак апладысменты ў кіназале паступова замоўклі, калі фашысты атрымалі першае паражэнне пад Масквой, калі ў Лунінецкі шпіталь паступілі абмарожаныя параненыя салдаты з-пад савецкай сталіцы.

Пасля выбуху партызанскай міны ў Мікашэвіцкім кінатэатры ў лістападзе 1942 года (тады загінула больш як 200 акупантаў) у Лунінцы адмянілі кінасеансы выключна для немцаў. Цяпер фільмы, калі былі жадаючыя з мясцовых, глядзелі на роўных. Аднак насельніцтва стала радзей хадзіць у кінатэатр, нават хлапчукі. Да таго часу ў свядомасці людзей шмат змянілася. Праўда, на кіначасопісы тыднёвай хронікі, дзе паведамлялася пра Сталінград ці Курск, лунінчан не пускалі — мясцовыя жыхары маглі ўвайсці ў залу толькі пасля іх дэманстрацыі. Але ж зразумець тое, што адбываецца, можна было і без хронікі: пасля разгрому фашысцкіх войскаў пад Сталінградам і палону фельдмаршала Паўлюса ў Германіі быў аб'яўлены жалобны «дзень герояў», у Лунінцы таксама былі прыспушчаны сцягі з прышпіленымі да іх чорнымі стужкамі...

Восенню 1941 года акупанты выкарысталі закрыты брукаваны двор былога гарэлачнага склада для стаянкі палявых пякарняў. Частку склада прыстасавалі для захоўвання гатовай прадукцыі, у другой была абсталявана пякарня. Штодня з варот выязджалі дзясяткі машын, што развозілі хлеб па воінскіх часцях. Па нашай вуліцы стаяў дурманлівы пах свежага хлеба, і калі ў 1941-м ён асабліва не хваляваў, то ў галодных 1943—1944 гадах ад гэтага паху кружылася галава і вельмі хацелася есці. Да святаў (Вялікадня і Каляд, да Новага года і некаторых іншых дат) у пякарні рабілі «кухены» — булкі. Хлапчукі навучыліся красці з машын хлеб і гэтыя «кухены», асабліва зімой. На самаробных драўляных каньках мы даганялі машыну, чапляліся крукам з дроту за борт, а другім, больш доўгім, дротам імкнуліся падчапіць бохан хлеба ці «кухен» і, у выпадку ўдачы, хутка адчапіцца ад машыны ды збегчы са здабычай. Не заўсёды гэта ўдавалася. Красці ў немцаў хлеб (ці што іншае) было небяспечнай задумай. Бывала, што шафёр і яго напарнік спыняліся, выскоквалі з машыны, лавілі хлопчыка і збівалі яго. Цярпелі многія, але жаданне мець хлеб было мацнейшае за страх. Кожны думаў, што абыдзецца. Іншы раз у кузаве машыны сядзеў салдат, якога не было бачна, і тут жа біў хлопчыка прыкладам вінтоўкі. Так, сябар майго дзяцінства Цімафей Пракаповіч, самы смелы сярод хлопчыкаў нашага раёна, атрымаў пералом прадплечча. Мне пашанцавала двойчы — «канфіскаваў» з машыны два боханы хлеба. Аднак пасля выпадку з Цімафеем кінуў гэтую справу: сябар лячыўся ў гарадской бальніцы, яго бацькам даводзілася за гэта плаціць.

Нягледзячы ні на што, усе мы, хлопцы тых ваенных гадоў, адрозніваліся нейкай упартасцю, дзёрзкасцю, неабдуманасцю, безразважнасцю сваіх учынкаў, якія маглі закончыцца трагічна. Аднак пра гэта тады не думалі, не надавалі значэння словам папярэджання і забарон сваіх бацькоў. І калі ў аўтамабілі праходзячай праз Лунінец вайсковай часці, які спыніўся каля варот нейкага дома, а афіцэры, якія ў ім ехалі, выйшлі адпачыць, хтосьці з хлопчыкаў выявіў пакінуты трохкаляровы ліхтарык, ці пачак цыгарэт, ці шафёрскі партсігар-аўтамат для згортвання самакрутак, ці трубачку цукерак «Бон-Бон», то прыкладвалі ўсе намаганні, каб убачанае неяк забраць. Удавалася нават «канфіскаваць» металічную скрыньку з нямецкім салдацкім наборам інструментаў і прылад для чысткі вінтоўкі. Ухітрыліся каля царквы адкруціць фару з разбітага матацыкла і лямпачкі (яны былі асаблівай доўгай формы) з указальнікаў паваротаў на аўтамашынах. Аднойчы нават была ўзята з падаконня адчыненага акна венгерская граната. Але запаветнай марай любога з нас было скруціць працуючы акумулятар з матацыкла і аўтамабіля і прынесці яго дамоў, каб мець святло. Электрычнасць часта адключалі (летам яе наогул не было). У нашым доме было тры акумулятары, і зімовымі вечарамі сям'я мела святло.

Пасля знішчэння яўрэйскага гета нямецкія ўлады вырашылі знішчыць так званых «выхрыстаў», якія не былі змешчаны ў гета. Так у Лунінцы называлі сем'і, у якіх муж ці жонка былі яўрэямі, але па розных прычынах прынялі хрысціянскую веру, здзейсніўшы абрад хрышчэння. Іх было некалькі. У пачатку акупацыі немцы не цікавіліся гэтымі сем'ямі. Але летам 1943 года ўсе «выхрысты» былі арыштаваны і адразу ж расстраляны на «бензінцы».

Сярод ахвяр была сям'я вядомага ў горадзе гандляра Леана Цхаўрэбава (Цхаўрэбашвілі). Галава сям'і — былы афіцэр з каўказскага (татарскага) батальёна кавалерыі генерала Булак-Балаховіча — застаўся ў Лунінцы пасля заканчэння польска-савецкай вайны, закахаўся ў яўрэйку Троцкую, адзіную дачку небагатых бацькоў. Заснаваў сваю справу — магазін каланіяльных тавараў: апельсіны, бананы, разынкі, вінаград і фінікі. Найлепшыя фрукты ў Лунінцы! Гандляваў таксама мясам і каўбасой, якія былі выраблены асабліва, «каўказскім», спосабам. Гэтыя прадукты карысталіся вялікім попытам у лунінчан. Яго жонка прыняла хрысціянства, была вельмі набожнай, часта наведвала царкву разам з мужам, нават удзельнічала ў царкоўным савеце. Дваіх дзяцей яны таксама пахрысцілі ў лунінецкім храме. Але гэта не выратавала сям'ю ад «канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання»...

Была яшчэ адна трагічная гісторыя, пра якую гаварылі, сцішыўшы голас. У Лунінцы чамусьці засталася жонка аднаго з работнікаў НКУС з 5-6-гадовым сынам. Хтосьці данёс пра гэта гестапа. Яе арыштавалі, трымалі разам з хлопчыкам у склепе былой павятовай гміны, на допытах збівалі. Потым па незразумелых прычынах адпусцілі. Пасля арыштавалі зноў. На расстрэл жанчыну з хлопчыкам вялі праз увесь горад. Сына яна несла на руках. Расправа гестапаўцаў над безабароннай маці і дзіцем вельмі паўплывала на жыхароў, пра гэта распавядалі са слязьмі на вачах. Ніхто не ведаў, што з намі будзе заўтра...

**Леў КОЛАСАЎ**

Даты | Падзеі | Людзі

**14 МАЯ**




**1900** год — 115 гадоў таму распачаліся II Алімпійскія гульні. Пасля паспяховага правядзення I Алімпійскіх гульняў сучаснасці Грэцыя (як краіна-арганізатар і радзіма алімпійскага руху) стала прэтэндаваць на права правядзення і ўсіх наступных спаборніцтваў. Аднак МАК (Міжнародны алімпійскі камітэт), улічваючы прапанову П'ера дэ Кубертэна праводзіць гульні ў розных краінах для надання алімпійскаму руху сапраўды міжнароднага характару і прызнаючы яго асабістыя заслугі ў адраджэнні Алімпійскіх гульняў, вырашыў правесці чарговыя спаборніцтвы ў Парыжы. Паколькі ў Французскага нацыянальнага алімпійскага камітэта не аказалася дастатковых сродкаў для правядзення Алімпіяды як асобнага мерапрыемства, яе вырашылі прымеркаваць да Сусветнай выставы, якая праходзіла ў той час у французскай сталіцы. І хоць дырэктар выставы Альфрэд Пікард лічыў спорт «бескарысным і абсурдным заняткам» і быў супраць гэтай задумы, ён усё ж такі пагадзіўся, каб II летнія Алімпійскія гульні прайшлі ў Парыжы з 14 мая па 28 кастрычніка 1900 года ў рамках Сусветнай выставы. Варта адзначыць, што ў параўнанні з мінулымі Гульнямі ў Афінах гэтыя сталі больш масавымі і разнастайнымі па відах спорту. Тут, паводле даных МАК, удзельнічала 997 спартсменаў з 24 краін, сярод якіх была і Індыя — першая азіяцкая краіна, прадстаўленая на Гульнях. Прычым упершыню ў Алімпіядзе ўдзельнічалі жанчыны — 22 спартсменкі разыгралі медалі ў спаборніцтвах па тэнісе і гольфе.

**1907** год — нарадзіўся (вёска Арэшкавічы, цяпер Пухавіцкі раён) Іосіф Іосіфавіч Жыновіч, беларускі цымбаліст, дырыжор, кампазітар і педагог. Народны артыст Беларусі (1955), народны артыст СССР (1968). Першы прафесійны беларускі цымбаліст. Заснавальнік класа цымбалаў і кафедры народных інструментаў у Беларускай кансерваторыі. З 1946 года — мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Дзяржаўнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1968). Памёр у 1974 годзе. З 1987 года ў краіне праводзіцца Рэспубліканскі конкурс выканаўцаў імя І. Жыновіча.

**1955** год — 60 гадоў таму ў Варшаве падпісаны Дагавор аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе паміж еўрапейскімі краінамі сацыялістычнай садружнасці, на аснове якога была створана Арганізацыя Варшаўскага дагавора. У падпісанні ўдзельнічалі Балгарыя, Венгрыя, ГДР, Польшча, Румынія, СССР, Чэхаславакія і Албанія. З 1962 года Албанія не ўдзельнічала ў працы арганізацыі, а ў верасні 1968-га выйшла з яе. Арганізацыя Варшаўскага дагавора спыніла сваё існаванне згодна з пратаколам, падпісаным кіраўнікамі дзяржаў-удзельніц 1 ліпеня 1991 года.

### Было сказана

**Валянціна АКОЛАВА, паэтэса:**

*«Пустазелле губіць поле, а няслава — ўсё людское».*


## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТМЕНЕ АУКЦИОНА

ЗАО «Центр промышленной оценки» извещает об отмене открытого аукциона, назначенного на **19.05.2015,** по продаже одним лотом объектов недвижимого имущества ОАО «Гроднорайагросервис», расположенных на земельном участке пл. 8,6869 га, по адресу: **Гродненская обл., Гродненский р-н, Обуховский с/с, д. Котра, ул. Молодежная, 2.**

Извещение, опубликованное в газете «Звязда» от 08.05.2015, считать недействительным.

**Тел.: +375 17 280 36 37; +375 29 183 69 71.**
**www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

УНП 500030462



Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ЗАО «Юнифуд» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже:**

**Здания магазина** с инвентарным номером 610/С-325, общ. пл. 1197,6 кв.м, расположенного по адресу: Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. Гагарина, 48. Составные части и принадлежности: двухэтажное кирпичное здание магазина с компрессорной (Е2/к), теплоузлом (Е2/К), рампой (1), приямком, приямком, крыльцом, крыльцом, крыльцом. Земельный участок пл. **0.1784 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания магазина.

**Начальная цена с НДС 20% – 18 000 000 000 бел.руб.**

*Задаток 10% от начальной цены в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».*

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10** (десяти) рабочих дней после проведения аукциона.

**Условия оплаты:** Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

*Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 31.03.2015 г.*

Аукцион состоится **29.05.2015** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.05.2015** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: +375 17 280 36 37; +375 29 183 69 71.**
**www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**



## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

**по объекту «Многоквартирные жилые дома № 11, 12, 13, 14 по генплану в районе пересечения улиц Проектируемой №1, Проектируемой №2 в границах жилого района «Лебяжий». Дом № 14 без инженерных сетей»,**

***опубликованную в газете «Звязда» от 11.02.2015 №26(27884).***

**Дополнить пункт следующего содержания.**

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства **для юридических лиц и граждан, не состоящих на учете нуждающихся** в улучшении жилищных условий, предлагаются:

1 (одна) однокомнатная квартира ( № 86);

7 (семь) двухкомнатных квартир ( №№132; 136; 140; 144; 148; 152; 156);

2 (две) трехкомнатные квартиры (№№ 139; 143).

Стоимость 1 м² жилья для однокомнатной квартиры на дату опубликования проектной декларации при единовременной оплате:

1 050 долларов США по курсу Нацбанка на день оплаты.

Стоимость 1 м² жилья для двухкомнатной квартиры на дату опубликования проектной декларации при единовременной оплате:

1 050 долларов США по курсу Нацбанка на день оплаты.

Стоимость 1 м² жилья для трехкомнатной квартиры на дату опубликования проектной декларации при единовременной оплате:

1 000 долларов США по курсу Нацбанка на день оплаты.

**Условия оплаты** – первоначальный взнос в размере 100% стоимости в течение **10 (Десяти) календарных дней** со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме.

Оплата производится в белорусских рублях на специальный и расчетный счета застройщика.

**Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве:**

Для подачи заявления необходимы: паспорт и личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор.

Прием заявлений осуществляется с 21.05.2015 г. и до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных квартир.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству жилого дома можно получить по адресу: 220004, г. Минск, ул. Мельникайте, 3. Режим работы: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15, перерыв (понедельник – пятница) с 13.00 до 13.45. Тел. 306-07-26.

УНП 190580566

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ПУТЕМ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

**ЗАО «Выставочный центр «Аквабел» Минский район ПРОВОДИТ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ СЛЕДУЮЩЕГО ИМУЩЕСТВА:**

| № лота | Наименование объекта | Адрес объекта | Начальная стоимость в условных единицах, эквивалентных долларам США по курсу НБ РБ | Размер задатка в условных единицах, эквивалентных долларам США по курсу НБ РБ |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Автомобиль TOYOTA CAMRY Hybrid, б/у, 2006 г.в., кузов № 4T1BB46K17U002177 | Минский р-н, пересечение Логойского тракта и МКАД | 10476 | 1048 |
| 2. | Автомиксер МАЗ-533702-2180 с оборудованием тип СМБ-149, шасси № Y3M53370230000973, б/у, 2003 г.в. | Минский р-н, д. Курганы | 3333 | 333 |
| 3. | Автомиксер МАЗ-533702-2180 с оборудованием тип СМБ-149, шасси № Y3M53370240002293, б/у, 2003 г.в. | Минский р-н, д. Курганы | 3333 | 333 |

Условия проведения аукциона:

Организатором аукциона и продавцом является Закрытое акционерное общество «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район, адрес: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, административное здание, комната 302.

Торги состоятся **26.05.2015 года** в **10.00** по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, административный блок ГВП, 2-й этаж, к. 208.

Шаг аукциона – **5%** начальной стоимости объекта.

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица любой формы собственности.

Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы:

заявление на участие в аукционе и об ознакомлении с объектом;

заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесения задатка в белорусских рублях;

юридическими лицами – резидентами Республики Беларусь – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

представителями физических лиц – резидентов Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность;

*Задаток перечисляется по безналичному расчету в белорусских рублях на расчетный счет ЗАО «Выставочный центр «АКВАБЕЛ» Минский район» № 3012204960010 в ф-ле Минская городская дирекция ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, код 153001963, УНН 600438617.*

Задаток возвращается всем участникам аукциона, кроме участников аукциона, выигравших торги, в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона или с момента регистрации продавцом (организатором аукциона) отказа от участия в аукционе. Участнику аукциона, выигравшему торги, задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах.

Победитель аукциона заключает договор купли-продажи в течение 5 (пяти) банковских дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. В случае уклонения или отказа от заключения договора задаток победителю аукциона не возвращается.

Оплата стоимости приобретенных на аукционе объектов осуществляется по безналичному расчету в белорусских рублях в течение 10 банковских дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.

Заявки на участие в аукционных торгах принимаются до **14.00 25.05.2015 года** включительно по адресу: Минский район, пересечение Логойского тракта и Минской кольцевой автодороги, административное здание, 3-й этаж, комната 303.

**Тел.: (017)237-91-32, (029)261-02-84.**

УНП 600438617



## РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона**
**ПО ПРОДАЖЕ ИЗОЛИРОВАННЫХ ПОМЕЩЕНИЙ (ЛОТ №2):**
**производственное помещение №11,**
**инв. №500/D-7113875 (общая площадь – 1617,4 м²);**
**помещение неустановленного назначения №13,**
**инв. №500/D-7113877 (общая площадь – 30,7 м²);**
**производственное помещение №14,**
**инв. №500/D-7113878 (общая площадь – 80,9 м²),**
**расположенных по адресу:**
**г. Минск, пр-т Независимости, д. 58, пом. 11, 13, 14,**
**принадлежащих ОАО «Амкодор-Белвар» (Продавец).**

**Начальная цена с НДС – 18 000 000 000 бел. руб.**
**Задаток с НДС – 180 000 000 бел. руб.**

*Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества ОАО «Амкодор-Белвар» (изолированные помещения),* **проводимом 17 июня 2015 г.**

Договор купли-продажи Лота №2 должен быть заключен в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня проведения аукциона. Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота №2 согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 0,5% (ноль целых пять десятых процента) от цены продажи Лота №2 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион состоится **17.06.2015 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 15.06.2015 до 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 2.

*Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 22.07.2014.* С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

**☎ Дополнительная информация:**
**8(017) 306-00-57, 8(029) 356-90-03, 8(029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**



Утерянную квитанцию формы 1 СУ о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) серии КС № 1897785 в количестве 1 шт. Представительства Белгосстраха по Червенскому району **считать недействительной.**

УНП 600013344


# ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Ты – счастливчик!»

**1.** Настоящая рекламная Игра называется **«Ты – счастливчик!»** (далее по тексту – Игра или рекламная игра), проводится в соответствии с условиями настоящих Правил (далее по тексту – Правила) с соблюдением требований законодательства Республики Беларусь без взимания с Участников Игры платы.

**2. Организатором Игры** является Закрытое акционерное общество «Сэлмон-Графикс», УНП 100843219 (далее — Организатор), зарегистрировано Решением Мингорисполкома от 2 декабря 2008 года. Местонахождение Организатора: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 11, комн. 43.

**Заинтересованным лицом** является Совместное закрытое акционерное общество «АСБИС» (далее – Заинтересованное лицо), 220118, г. Минск, ул. Машиностроителей, 29, оф. 212, УНП 100079992.

**3.** Игра проводится **в период с 15 мая по 07 августа 2015 года** на территории Республики Беларусь, включающий в себя:

3.1. Сроки совершения действий для участия в Рекламной игре: с «15» мая 2015 года по «15» июля 2015 года включительно;

3.2. Дату проведения розыгрыша Рекламной игры: «27» июля 2015 года;

3.3. Сроки публикации результатов проведения Рекламной игры: до «31» июля 2015 года;

3.4. Сроки выдачи приза Рекламной игры: до «07» августа 2015 года включительно.

**4. Категории товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Игра:**

Видеорегистраторы ТМ «Prestigio» модель RoadRunner 320 в специальной упаковке, реализуемые на территории Республики Беларусь. Специальная упаковка видеорегистратора отличается от упаковки, в которой аналогичный товар реализуется обычно, наличием стикера с наименованием Рекламной игры.

**5. Призовой фонд Игры.**

| № | Наименование | Ед. изм. | Кол-во | Всего, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | а/м легковой Renault Sandero (новый) 2015 г.в.; 1,6 (бензин); цвет: лазурно-синий металлик; номер кузова: X7L5SRAVG52522416 стоимостью 175 000 000 белорусских рублей + денежная сумма в размере 26 019 425 белорусских рублей. | шт. | 1 | 201 019 425 |

Призовой фонд игры в размере 201 019 425 (Двести один миллион девятнадцать тысяч четыреста двадцать пять) формируется за счет денежных средств Заинтересованного лица.

**6.** В Игре могут принимать участие физические лица, проживающие на территории Республики Беларусь в период проведения Игры (далее по тексту Участники), с учетом ограничений, изложенных в настоящих Правилах.

В случае если в Игре принимают участие лица, не достигшие совершеннолетия либо ограниченно дееспособные лица, то участие таких лиц осуществляется строго в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и настоящими Правилами, в т.ч. посредством их законных представителей.

Участником рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, члены комиссии по проведению рекламной игры, а также супруг (супруга) таких лиц, их близкие родственники, лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства. Участник вправе участвовать в данной Рекламной игре неограниченное количество раз с учетом требований, предусмотренных настоящими Правилами.

**7. Права Участников Игры.**

Участник Игры имеет право:

7.1. Знакомиться с Правилами Игры;

7.2. Принимать участие в Игре на условиях, определенных Правилами;

7.3. Получать соответствующие Призы (при условии соблюдения указанных ниже условий);

7.4. Иные права, предусмотренные законодательством Республики Беларусь.

Каждый Участник может принимать участие в Игре неограниченное количество раз.

**8. Права и обязанности Организатора.**

Организатор имеет право в рамках Игры:

8.1. Размещать рекламные и иные материалы;

8.2. Проводить интервью с Победителями и Участниками Игры, производить фото- и видеосъемку указанных лиц;

8.3. Иные права, предусмотренные законодательством Республики Беларусь.

**9. Создание комиссии по проведению Игры.**

Для контроля за соблюдением правил Игры, утверждения результатов, подведения итогов по результатам проведения розыгрышей Игры, Организатором создается комиссия по ее проведению в следующем составе:

Председатель:

- Гурина Валентина Леонидовна, заместитель директора по маркетингу СЗАО «АСБИС».

Члены комиссии:

- Рахманенко Евгения Геннадьевна, специалист по маркетингу СЗАО «АСБИС»;

- Стельмах Александр Петрович, заместитель директора по правовым вопросам ООО «Медиа-Крама»;

- Черненков Павел Леонидович, начальник отдела рекламных проектов, ЗАО «Сэлмон-Графикс»;

- Богдусевич Ирина Сергеевна, специалист отдела рекламных проектов, ЗАО «Сэлмон-Графикс».

**10. Описание Игры.**

10.1. Для участия в Рекламной игре необходимо с «15» мая 2015 года по «15» июля 2015 года включительно выполнить следующие действия:

10.1.1. приобрести в любой торговой точке на территории Республики Беларусь видеорегистратор ТМ «Prestigio» модель RoadRunner 320 в промо-упаковке со стикером Рекламной игры.

10.1.2. обнаружить скретч-карту с уникальным кодом внутри упаковки видеорегистратора;

10.1.3. зарегистрировать покупку на сайте **www.prestigio.by/promo**, указав в специальных полях регистрационные данные: фамилию, имя, отчество, пол, дату рождения, e-mail (электронная почта), номер мобильного телефона в международном формате +375 XX XXXXXXX, город (место проживания), ввести уникальный код со скретч-карты, и загрузив в специальное поле отсканированную копию или фотографии чека на покупку видеорегистратора, отвечающую следующим требованиям:

- Фотография и/или отсканированная копия должны иметь один из форматов: jpg, jpeg, png, и не превышать по размеру 6 (Шесть) мегабайт;

- Чек на изображении должен быть хорошо читаемым и содержать сведения о покупке видеорегистратора в сроки с «15» мая 2015 года по «15» июля 2015 года включительно;

- Фотография и/или отсканированная копия чека должны быть оригинальными и подлинными (т.е. являться непосредственно фотографией или отсканированной копией чека – фотографии и/или отсканированные копии, подвергавшиеся любому редактированию, в том числе коллажи, в качестве фотографии/отсканированной копии для целей участия в настоящей Игре не рассматриваются и права на участие в Игре не даёт);

- Фотография и/или отсканированная копия не должны содержать иной информации, помимо отпечатанных в чеке сведений о покупке.

10.2. Один уникальный код может быть указан при регистрации покупки на сайте **www.prestigio.by/promo** для участия в Игре один раз. В том случае, если уникальный код будет зарегистрирован более одного раза, он будет приниматься только один раз по факту первой регистрации уникального кода. Организатор не вступает в споры и не является свидетелем в случае возникновения споров связанных с тем, кем был приобретён видеорегистратор, в упаковке которого находилась скретч-карта со спорным уникальным кодом.

10.3. Изображение одного чека может быть загружено в виде фотографии и/или отсканированной копии один раз. Повторная загрузка чека не допускается.

10.4. **Участники обязаны сохранять оригинал чека и скрэтч-карту до момента окончания Игры.**

10.5. Каждому зарегистрированному уникальному коду Организатором присваивается уникальный порядковый номер, согласно даты и времени регистрации на сайте. Данный номер наносится на карточку, которая впоследствии помещается в лототрон и участвует в непосредственном розыгрыше приза.

**11. Порядок проведения и условия розыгрыша приза.**

11.1. Розыгрыш приза:

Розыгрыш приза состоится 27 июля 2015 года в 15.00 в офисе Организатора по адресу: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, офис 206.

11.2. За ходом розыгрыша приза следит комиссия по проведению Игры (далее – Комиссия). Итоги розыгрыша приза Игры фиксируются в Протоколе, который составляется и подписывается присутствующими членами комиссии.

